ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 МАЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 97 (28713)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Кампетэнцыі XXI стагоддзя



Каго трэніруе каралева?



Будні ўрача хуткай дапамогі

# Дзікі мёд

У Лельчыцкім раёне захаваўся і дагэтуль развіваецца старадаўні промысел — бортніцтва. Зараз у раёне жыве каля 200 бортнікаў. Усе яны карыстаюцца калодамі для збору мёду дзікіх пчол, вырабленымі бацькамі, дзядамі і прадзедамі. Патомны бортнік Уладзімір АСТАПОВІЧ з аграгарадка Мілашавічы займаецца промыслам з дзяцінства — дапамагаў бацьку і дзеду.



Фота БелТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ГУНЬКО, намеснік міністра прамысловасці:**

*«Прадпрыемствы Мінпрама сёлета пачалі экспарт прадукцыі ў 23 новыя краіны, што гаворыць пра тэндэнцыю ўздыму прамысловай вытворчасці. Па выніках першага квартала гэтага года прадэманстраваны добрыя вынікі. Так, тэмп росту аб'ёму прамысловай вытворчасці за гэты перыяд склаў больш за 117 %, экспарту — 127 %. Самае галоўнае, што ў першым квартале мы экспартавалі тавары ў 93 краіны. Работа па дыверсіфікацыі экспартных рынкаў, праведзеная Мінпрамам у 2017 годзе і сёлета ў студзені — сакавіку, дае станоўчы вынік. Так, у 2017 годзе доля Расіі ў агульным аб'ёме экспарту прамысловасці склала 60 %, сёння — практычна 50 %. Мы знаходзім пакупнікоў сваёй тэхнікі на тэрыторыі Еўрапейскага саюза. Напрыклад, па станкабудаванні выйшлі на рынак Германіі — традыцыйны рынак па вытворчасці станкоў».*

■ Размова па сутнасці

## «РЭЗЕРВАЦЫЯ» ДЛЯ ТУРЫСТАЎ

### Ці стануць гісторыка-культурныя каштоўнасці арганічнай часткай нашага жыцця?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Усе помнікі рана ці позна разбурацца — гэта непазбежны працэс. Сентэнцыя дзіўная, улічваючы, што сказана яна была падчас правядзення круглага стала аб захаванні і рэстаўрацыі гісторыка-культурнай спадчыны. І тым не менш справядлівая. Перад захавальнікамі мінулага ёсць некалькі шляхоў. Можна закрыць помнік стэрыльным купалам і такім чынам працягнуць яго жыццё яшчэ на некалькі стагоддзяў. Ці наадварот, упісаць сведку старажытнасці ў архітэктуру нашага імклівага часу. Пра метады аховы гісторыка-культурных аб'ектаў, праблемы рэстаўрацыі і ролю ў гэтых працэсах грамадства паразважалі эксперты.**

СТАР. 13

■ Самыя

*«Звязда» распачынае новы праект, у якім мае намер расказаць пра розныя рэгіёны Беларусі, да адметнасці якіх можна прымяніць прыслоўе «самы». Мы вырашылі пачаць з самага маладога ў краіне — Дрыбінскага. Да таго ж і старшыня райвыканкама там прызначаны ўсяго толькі тры месяцы таму. З аднаго боку, гэты тэрмін яшчэ дазваляе падзяліцца свежым поглядам, з другога — дастатковы, каб агледзецца і вызначыцца з найбліжэйшымі планамі. Гэта інтэрв'ю — першае, якое старшыня Дрыбінскага райвыканкама дае на сваёй пасадзе.*

**Дрыбінскі раён: самы малады**

## НЕ ТОЛЬКІ ВАЛЁНКІ

### Раён, вядомы як захавальнік традыцый, гатовы рушыць наперад



**29 снежня 1989 года Дрыбінскі раён быў аднаўлены трэці раз за сваю гісторыю. У наступным годзе ў шасці вёсках — Трылесіна, Расна, Пудаўня, Міхееўка, Кароўчына і Белая — былі пабудаваны пасёлкі для перасяленцаў з іншых раёнаў краіны ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС. Раён тройчы наведваў Прэзідэнт Беларусі — у 1996, 1997 і 1998 гадах. Зараз тут пражывае 9700 чалавек. Апошнім часам мясціны гэтыя набылі вядомасць у краіне і за яе межамі дзякуючы рамяству, якое ўдалося не толькі захаваць, але і развіць, — шапавальству. Яшчэ ў раёне адрадзілі і папулярызуюць лапцепляценне. Тут увогуле трапятлівая адносяцца да народнай культуры і да прыроды. Хочацца дадаць — і да чалавека. Напрыклад, на Дрыбіншчыне знаходзіцца найлепшае ў вобласці аддзяленне для кругласутачнага знаходжання састарэлых і інвалідаў. Аднак асноўнае, чым жыве рэгіён, — сельская гаспадарка. Яна і стала галоўнай тэмай нашай размовы з кіраўніком раёна Дзмітрыем ГАТОЎЧЫКАМ.**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ
Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
Заставайцеся з намі – будзе цікава!

■ Парламенцкі дзённік

# ПЕРАНЯЦЬ І РЭАЛІЗАВАЦЬ

## Беларусь разлічвае на супрацоўніцтва з Еўрасаюзам для развіцця лічбавай эканомікі

**Такі намер учора выказаў намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Баляслаў ПІРШТУК на сустрэчы з дэлегацыяй паслоў па асобых даручэннях краін Еўрапейскага саюза па справах «Усходняга партнёрства».**

Віцэ-спікер адзначыў, што краіны Еўрасаюза маюць добрыя пазіцыі ў плане лічбавай эканомікі, дэкрэт аб развіцці якой быў прыняты ў Беларусі ў канцы 2017 года. «Мы ведаем вопыт краін, якія маюць у гэтым плане добрыя вынікі. Таму вельмі хацелася б, каб краіны з пераходнай эканомікай, такія як Беларусь, у самыя кароткія тэрміны рэалізавалі ў сябе вопыт, які маюць еўрапейцы», — адзначыў ён.

Баляслаў Пірштук таксама расказаў, што беларуская дэлегацыя ў Парламенцкай асамблеі АБСЕ на чарговым пасяджэнні плануе прапанаваць рэзалюцыю аб прасоўванні лічбавай эканомікі на прасторы гэтай арганізацыі, каб умацніць эканамічны складнік у адносінах краін рэгіёна АБСЕ.

Акрамя таго, ён падкрэсліў, што для Беларусі адным з асноўных кірункаў гандлёва-стратэгічнага характару з'яўляюцца адносіны з Еўрасаюзам. «У мінулым годзе тавараабарот з ЕС вырас практычна на 30 %, — звярнуў увагу Баляслаў Пірштук. — Ён склаў ужо 27 % ад агульнага аб'ёму нашага знешняга тавараабароту. Гэта добры сігнал, гэта пацвярджае, што мы знаходзімся на правільным шляху ў супрацоўніцтве з нашымі партнёрамі па Еўрапейскім саюзе».

Акрамя тэхналагічных распрацовак, Беларусь зацікаўлена і ў інвестыцыйным супрацоўніцтве з еўрапартнёрамі, таму ў тым ліку на заканадаўчым узроўні ў нашай краіне ствараюцца спрыяльныя ўмовы для інвестараў. Віцэ-спікер дадаў, што на цяперашні момант у нас даволі шмат праектаў з Еўрасаюзам па розных напрамках — пачынаючы ад інфраструктурных аспектаў і заканчваючы падтрымкай праектаў малога і сярэдняга бізнесу. «Нам хацелася б, каб іх было больш і яны прасоўваліся больш хуткімі тэмпамі», — падкрэсліў Баляслаў Пірштук.

На сустрэчы намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў прапанаваў абмеркаваць сучасныя выклікі і пагрозы, з якімі сутыкаюцца дзяржавы, у тым ліку і ўдзельнікі ЕС. Пазней пасол па асобых даручэннях МЗС Польшчы Ян Хафмокль адзначыў, што такія сустрэчы дапамагаюць наладзіць канструктыўны дыялог, пагаварыць аб пытаннях, важных для будучага супрацоўніцтва.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ** ■

# БАЧЫЦЬ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ ЛЮДЗЕЙ

## Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце плануюць надаць асаблівы статус

**Аб гэтым заявіла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА, прадстаўляючы калектыву акадэміі новага рэктара Генадзя Пальчыка.**

«Прэзідэнт паставіў задачу: гэта павінна быць найлепшая ВНУ, самая галоўная ВНУ, — падкрэсліла яна. — Мы ўжо думаем пра тое, што ў гэтай навучальнай установы павінен быць асаблівы статус. Мы дакладвалі кіраўніку дзяржавы, і ён пагадзіўся з намі».

Наталля Качанава таксама расказала, што Прэзідэнт хоча раз на паўгода бываць у Акадэміі, каб сустракацца з прафесарска-выкладчыцкім складам, слухачамі і студэнтамі. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта дадала, што гэта ўсё плануецца і сапраўды павінна быць на пастаяннай аснове.

Яна адзначыла, што работа ВНУ заўсёды знаходзіцца пад пільным кантролем усіх кіраўнікоў органаў улады і перш за ўсё Аляксандра Лукашэнкі, паколькі асноўная задача акадэміі — рыхтаваць высокапрафесійныя, адказныя і ініцыятыўныя кіраўнічыя кадры.

На думку Наталлі Качанавай, вельмі важна ўбачыць перспектыўных людзей, якія могуць па сваіх асобасных і прафесійных якасцях займаць высокія пасады ў Беларусі. «Трэба пераглядзець праграмы, паглядзець, хто працуе тут. Павінны быць і стажыроўкі, і абмен меркаваннямі, вопытам з іншымі краінамі, каб людзі, якія выкладаюць тут, былі найлепшымі педагогамі ў краіне», — дадала яна.

**Паводле БелТА.**

■ Міжнародны кантэкст

# КРОК ЗА КРОКАМ

## Дыялог паміж ЕС і ЕАЭС умацуе давер і выключыць барацьбу за сферы ўплыву ва Усходняй Еўропе

**Аб гэтым заявіў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ на адкрыцці ў Мінску міжнароднага форуму «Усходняя Еўропа: у пошуках бяспекі для ўсіх».**


Фота БелТА.

«Эканамічнае саперніцтва і гандлёвыя канфлікты — класічныя прычыны абвастрэння міжнародных адносін. Гэта мы наглядна бачым сёння, прыклады перад нашымі вачыма», — сказаў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства.

На яго думку, з гэтай прычыны Беларусь з'яўляецца актыўным прыхільнікам дыялогу паміж еўразійскім і еўрапейскім інтэграцыйнымі працэсамі. Уладзімір Макей дадаў, што прагрэс у гэтым кірунку спрыяў бы развянчанню міфа аб несумяшчальнасці гэтых мадэляў інтэграцыі.

Міністр замежных спраў Беларусі канстатаваў, што наша краіна мае кроўную зацікаўленасць у мірным вырашэнні канфліктаў, паколькі такі падыход, светаадчуванне выпакутаваны ўсёй нашай гісторыяй і незлічонымі стратамі. Ён адзначыў, што Другая сусветная вайна стала адным з найбольш моцных фактараў, якія вызначылі генетычную памяць нашага народа. «Праз 70 гадоў пасля завяршэння Другой сусветнай вайны нам, што называецца, і ў жахлівым сне не магло прысніцца, што дзесьці зусім побач, у прамым суседстве з намі, зноў будуць весціся маштабныя баявыя дзеянні, зноў будуць гінуць мірныя людзі», — сказаў Уладзімір Макей.

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства падкрэсліў, што ў Беларусі не было якіх-небудзь ваганняў, як сябе паводзіць у гэтай сітуацыі, таму Мінск стаў месцам вядзення перагавораў па ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне. Уладзімір Макей дапусціў, што прынятыя ў сталіцы дамоўленасці не заўсёды выконваюцца і не ідэальныя, але яны дазволілі спыніць у свой час маштабнае кровапраліцце.

Акрамя таго, міністр замежных спраў дадаў, што ў нашай краіне кожным нервам адчуваюць напал сённяшняга супрацьстаяння паміж дзяржавамі. У сваю чаргу, ва ўмовах рэзка ўзрослых супярэчнасцяў на міжнароднай арэне роля і значэнне невялікіх і сярэдніх краін, размешчаных на стыках Еўрапейскага саюза і ЕАЭС, НАТА і АДКБ, іншых міжнародных і рэгіянальных арганізацый, становіцца больш значнай, набывае дадатковую каштоўнасць. Таксама ён звярнуў увагу, што сёння на палітычным узроўні ў першую чаргу кажуць пра выклікі і пагрозы, пра новыя сцены неразумення і ўзаемных падазрэнняў.

Яшчэ Уладзімір Макей крытычна выказаўся з нагоды пасяджэнняў у Савеце Бяспекі ААН і Пастаянным савеце АБСЕ і заявіў, што яны ператварыліся ў абвінаваўчыя трыбуны, хоць павінны быць накіраваны на пошук шляхоў дасягнення міру, дабрабыту і спакою для ўсіх краін і народаў.

Падчас гутаркі з журналістамі міністр замежных спраў на пытанне аб перспектывах поўнай адмены заходніх санкцый у дачыненні да Беларусі адказаў так: «Рухаючыся паступова, крок за крокам, мы вырашым усе пытанні, якія звязаны з адменай санкцый».

Аб канкрэтных тэрмінах Уладзімір Макей не казаў, аднак ён дадаў, што вынікі ўзаемадзеяння з еўрапейскімі, амерыканскімі партнёрамі пацвярджаюць, «што сёння мы знаходзімся ў сітуацыі, калі ўсе бакі імкнуцца да паступовага пашырэння пазітыўнай атмасферы».

Дыялог з ЕС міністр ахарактарызаваў так: «Ідзе спакойны паступальны працэс. Мы абмяркоўваем усе тэмы, якія звязаны з нашымі ўзаемаадносінамі: палітычныя, эканамічныя, гуманітарныя, сацыяльныя і іншыя».

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства таксама адзначыў, што Беларусь зацікаўлена ў прагматычным узаемадзеянні краін ініцыятывы «Усходняе партнёрства» і яна павінна быць нацэлена на канкрэтную аддачу для людзей.

Дарэчы, плануецца, што сёння ў форуме прыме ўдзел і Прэзідэнт Беларусі. Паводле слоў Уладзіміра Макея, выступленне Аляксандра Лукашэнкі паслужыць штуршком для далейшых зацікаўленых дыскусій, у тым ліку за рамкамі мерапрыемства.

**Паводле БЕЛТА** ■

■ Добрая навіна

# ТЭХНАЛОГІІ СУПРАЦЬ АНКАЛОГІІ

**Дзве бальніцы Гомеля пачалі карыстацца новым абсталяваннем, якое дазваляе паспяхова змагацца з анкалагічнымі захворваннямі.**

У гомельскім абласным клінічным анкалагічным дыспансеры прэзентавалі новую тэхналогію лазернага лячэння раку. Аналагаў гэтаму паўправадніковаму лазеру для фотадынамічнай тэрапіі пакуль няма ў іншых рэгіянальных спецыялізаваных медустановах. Да нядаўняга часу тэхналогія прымянялася толькі ў сталічных клініках.

Працэдура лазернага лячэння займае ўсяго 10—20 хвілін. **Урач-анколаг-хірург Ірына КАНЦАВЕНКА** кажа, што яна дазваляе забіць менавіта злаякасныя клеткі:

— Фотадынамічная тэрапія — перспектыўная методыка. Перавага ў лакальным уздзеянні лазера на пухлінную тканку. Папярэдне пацыенту ўводзіцца прэпарат, які назапашваецца ў ракавых клетках. Падчас уздзеяння лазерам адбываецца фотахімічная рэакцыя. У выніку пухліна гіне, здаровыя тканкі захоўваюцца. На месцы ўмяшання застанецца незаўважны рубчык. Часцей за ўсё працэдура праводзіцца аднакратна. Пацыенты застаюцца сацыяльна актыўнымі, здольнымі да працягу працы. У 95—98 % выпадкаў хвароба не вяртаецца.

Апарат УПЛ-ФДТ закуплены за кошт пазабюджэтных сродкаў, зароблены дыспансерам пры аказанні платных паслуг насельніцтву, гаворыць **галоўны ўрач гомельскага анкадыспансера Дзмітрый ЛОСЬ:**

— Само абсталяванне і лекавы прэпарат «Фаталон» беларускай вытворчасці. У апарата шырокі спектр магчымасцяў. Абсталяванне запатрабавана ў дэрматаанкалогіі, отарыналарынгалогіі, гінекалогіі, дэрматалогіі, стаматалогіі, афтальмалогіі. Немалаважна, што лячэнне выконваецца ў амбулаторным рэжыме, пасля працэдуры пацыент ідзе дадому.

Тым часам у Гомельскую гарадскую бальніцу № 4 урачыста перададзена эндаскапічнае абсталяванне ў межах грантавай дапамогі ўрада Японіі «Карані травы». Выкарыстанне абсталявання дазваляе своечасова выявіць захворванні кішэчніка і выдаліць небяспечныя новаўтварэнні, якія выяўляюцца прыкладна ў 6 % пацыентаў. Ранняя дыягностыка прадухіляе развіццё анкалогіі і літаральна ратуе жыцці людзей. Як адзначыў пасол Японіі ў Рэспубліцы Беларусь Хірокі Такунага, з 2004 года ў межах праграмы «Карані травы» было рэалізавана 42 праекты на суму амаль $3,5 млн:

— Дапамога накіравана на пераадоленне наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Японскі народ глыбока суперажывае пацярпелым беларусам, паколькі жыхароў нашых краін аб'ядноўвае горкі досвед ядзерных катастроф.

Грант-кантракт паміж пасольствам Японіі ў Рэспубліцы Беларусь і гэтай лячэбнай установай быў падпісаны ў сакавіку 2017-га. І ўжо праз некалькі месяцаў урачы прыступілі да працы на новых гастрадуадэнаскопе і відэакаланаскопе. За гэты перыяд праведзена больш за 2500 абследаванняў. Дарэчы, падтрымку акрамя гомельскай бальніцы атрымалі яшчэ Чачэрская ЦРБ і Мінскі гарадскі клінічны анкалагічны дыспансер. Пасольства і надалей плануе ажыццяўляць падобныя праекты, каб падтрымаць жыхароў Беларусі і дапамагчы ім пераадольваць наступствы аварыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ** ■

**Калегія МУС Рэспублікі Беларусь, ветэраны органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю кіраўніка ведамаснай ветэранскай арганізацыі, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь генерал-лейтэнанта ўнутранай службы ў адстаўцы ПІСКАРОВА Віктара Аляксеевіча, у мінулым — міністра ўнутраных спраў Беларусі, начальніка Галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС СССР, дэпутата Вярхоўнага Савета БССР, і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю былога міністра ўнутраных спраў БССР, дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь адзінаццатага і дванаццатага скліканняў ПІСКАРОВА Віктара Аляксеевіча і выказваюць шчырае спачуванне яго родным і блізкім.**

# АЙЧЫННЫЯ ЭЛЕКТРАРУХАВІКІ І КАМПЛЕКТУЮЧЫЯ ДЛЯ АЎТО

## У Мінпраме расказалі аб перспектыўных праектах найбліжэйшай будучыні

**У 2020 годзе ў краіне плануюць запусціць тры сумесныя беларуска-кітайскія прадпрыемствы па вытворчасці камплектуючых для легкавых аўто, паведаміў намеснік міністра прамысловасці Сяргей ГУНЬКО. Ён растлумачыў, што новыя заводы будуць выпрацоўваць рухавікі ўнутранага згарання, цеплаабменнікі-радыятары, элементы інтэр'еру. Размесцяць прадпрыемства на тэрыторыях, прылеглых да завода «БелДжы». Праекты плануецца вывесці на поўную вытворчую магутнасць у 2020 годзе.**

«Акрамя таго, мы зацікаўлены ў рэалізацыі праектаў з нямецкай кампаніяй Siemens і кітайскай CRRC па будаўніцтве завода па вытворчасці электрарухавікоў для БелАЗа, МТЗ, «Белкамунмаша». Мы бачым, што гэты кірунак развіваецца вельмі дынамічна», — адзначыў Сяргей Гунько.

Паводле яго слоў, сёння існуе высокая патрэба ў электрычных рухавіках для трамваяў, тралейбусаў і электробусаў. «Таксама мы разглядаем ідэю стварэння электрычнага трактара для МТЗ», — дадаў замміністра.

Важныя падзеі для вытворцаў адбудуцца падчас Беларускага прамысловага форуму — 2018, які пройдзе з 29 мая да 1 чэрвеня ў сталіцы. У рамках мерапрыемства плануюцца секцыйныя пасяджэнні, дзе беларускія і замежныя кампаніі абмяняюцца вопытам у сферы аптымізацыі вытворчых працэсаў. Таксама прадстаўнікі зацікаўленых прадпрыемстваў абмяркуюць пытанні арганізацыі вытворчасцяў камплектуючых для легкавой аўтатэхнікі ў Беларусі.

«Пад нашы традыцыйныя прадпрыемствы мы абазначым праекты, якія зацікаўлены ў лакалізацыі прадукцыі, пачынаючы ад рухавікоў да дэкаратыўных элементаў салона аўто. Таксама на пасяджэннях мы запрашаем да супрацоўніцтва бізнес», — адзначыў Сяргей Гунько.

На форуме прадставяць напрамкі машынабудавання, буйных вытворцаў аўтамабільнай сельгастэхнікі. Дырэктар выставачнага прадпрыемства «Экспафорум» Аляксандр Старыкаў адзначыў, што акрамя беларускіх кампаній будуць прадстаўлены калектыўныя расійскія экспазіцыі Свярдлоўскай, Курганскай, Пскоўскай, Бранскай абласцей і горада Новасібірска. Таксама свае экспазіцыі прадставяць кампаніі Кітая, Украіны, Швецыі. На форуме пройдзе больш за 50 праграмных мерапрыемстваў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

# ВЯРНУЛІСЯ З МЕДАЛЯМІ

## У мексіканскім горадзе Канкун завяршыўся чэмпіянат свету па муай-тай

— У спаборніцтвах прынялі ўдзел больш за 500 спартсменаў з 82 краін, — паведаміў **галоўны трэнер нацыянальнай зборнай каманды па ўсходніх адзінаборствах, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь Міхаіл СЦЯПАНАЎ.** — Беларусь прадстаўлялі 11 байцоў. Ва ўзнагародным заліку наша каманда заняла пятае месца, саступіўшы Расіі, Тайланду, Украіне, Швецыі. Беларускія спартсмены заваявалі восем медалёў (два залатыя, тры сярэбраныя, тры бронзавыя).



Чэмпіёнка Алёна ЛЯШКЕВІЧ с трэнерам Міхаілам СЦЯПАНАВЫМ.

Чэмпіёнкай свету ў вагавой катэгорыі да 45 кілаграмаў стала інструктар па спорце першай катэгорыі спартыўнай каманды ўнутраных войскаў старшы сяржант Алёна Ляшкевіч. Тытул трохразовай чэмпіёнкі свету Ляшкевіч заваявала, перамогшы ў фінале саперніцу з Мексікі.

Акрамя гэтага, яна была прызнана найлепшай спартсменкай сярод жанчын, стаўшы ўладальніцай Кубка.

Бронзавыя медалі ў скарбонку зборнай паклалі інструктар па спорце другой катэгорыі спартыўнай каманды ўнутраных войскаў старшына Марыя Валент (60 кг), Марыя Белуш (75 кг) і Дзіяна Емяльянава (звыш 75 кг).

Мужчынская частка каманды таксама заваявала чатыры медалі. Золата ў катэгорыі да 67 кілаграмаў выйграў чэмпіён свету 2017 года Дзмітрый Варац. Каб абараніць леташні тытул, яму давялося правесці чатыры бai. У апошні дзень спаборніцтваў Дзмітрый біўся за званне чэмпіёна свету з прадстаўніком Венгрыі. У выніку па ачках наш спартсмен здолеў абысці саперніка і абараніць свой тытул.

**Старшыня грамадскай арганізацыі «Беларуская федэрацыя кікбоксінга і тайландскага бокса», намеснік міністра ўнутраных спраў — камандуючы ўнутранымі войскамі генерал-маёр Юрый КАРАЕЎ** высока ацаніў выступленне зборнай: «Усе байцы выкладаліся па максімуме, часам робячы немагчымае ва ўмовах кароткай кліматычнай і часавай адаптацыі. Асобна хачу адзначыць працу трэнераў Міхаіла Сцяпанава, Яўгена Дабратворскага, Юрыя Булата і Віталя Цішурава, а таксама ўрача каманды Алега Ярашэвіча. Зараз разглядаецца пытанне аб правядзенні штогадовых трэніровачных збораў непасрэдна ў Тайландзе, як гэта практыкуюць каманды тых жа Расіі і Украіны. А наперадзе ў нашай зборнай чэмпіянат Еўропы, які пройдзе 29 чэрвеня ў Празе».

**Аляксандра ГЕРАСІМЁНАК.**

■ На слыху

# ТОЙ ЯШЧЭ «КАДР»,

## ці Ад камеры — у камеру?

**У дачыненні да былога гендырэктара нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» заведзена крымінальная справа за злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі пры выкарыстанні бюджэтных сродкаў, выдзеленых Міністэрствам культуры на вытворчасць паўнаметражнага ігравога фільма «З 8 Сакавіка, мужчыны».**

Як паведаміла **старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах ГУБЭЗ крымінальнай міліцыі МУС Вераніка ПАСМЕЦЦЕВА,** устаноўлена, што ў 2012 годзе паміж Міністэрствам культуры і РУП «Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» быў заключаны дагавор на сумесную вытворчасць і выкарыстанне фільма «З 8 Сакавіка, мужчыны» агульным коштам амаль 3 мільёны рублёў (1,5 мільёна долараў).

Уладальнікам выключнага права на фільм і іншыя маёмасныя правы выступіла Міністэрства культуры, якое затраціла з бюджэту на вытворчасць фільма больш за 1 мільён рублёў (500 тысяч долараў), кінастудыя выдзеліла ўласных сродкаў амаль 1 мільён рублёў.

У красавіку 2013 года былы генеральны дырэктар нацыянальнай кінастудыі ад асобы кінастудыі заключае дагавор на вытворчасць фільма з расійскай кампаніяй ТАА «Маскіт», якой было інвеставана больш за 1 мільён рублёў.

Пазней кіраўнік кінастудыі, злоўжываючы службовымі паўнамоцтвамі, наўмысна заключыў у кастрычніку 2013 года дагавор з трэцяй асобай (таксама расійскім суб'ектам гаспадарання) на кінатэатральны паказ названага фільма на тэрыторыі ўсяго свету, а ў студзені 2014 года падпісаў дадатковае пагадненне аб перадачы ім выключнага права на фільм.

Пры гэтым падазраваны загадзя ведаў, што праваўладальнікам фільма «З 8 Сакавіка, мужчыны» на той момант з'яўлялася Міністэрства культуры і толькі з ліпеня 2014 года пасля падпісання акта прыёмкі фільма кінастудыя атрымае бязвыплатнае выключнае права на яго з абавязковай умовай аб накіраванні прыбытку ад выкарыстання фільма на развіццё фільмавытворчасці з далейшым накіраваннем штогадовых справаздач у Міністэрства культуры.

Такім чынам, былы дырэктар РУП «Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм», будучы службовай асобай, якая займае адказную пасаду, сваімі дзеяннямі прычыніў істотную шкоду дзяржаўным і грамадскім інтарэсам, якая праявілася ў страце міністэрствам і кінастудыяй правоў на самастойнае выкарыстанне фільма на тэрыторыі ўсіх краін свету, прычыненні страт у выглядзе неатрымання прыбытку ад камерцыйнага выкарыстання фільма, ненакіравання названага прыбытку на развіццё айчыннай кінематаграфіі і запаволенні яе рэфармавання, пагаршэнні эканамічнага становішча кінастудыі, падрыве яе дзелавой рэпутацыі.

У выніку, згодна з інфармацыяй з інтэрнэт-крыніц, расійскі бок атрымаў амаль 3 мільёны долараў ад выкарыстання фільма «З 8 Сакавіка, мужчыны», уклаўшы ў яго стварэнне 500 тысяч долараў, а Міністэрства культуры Беларусі і Нацыянальная кінастудыя, выдаткаваўшы на стварэнне фільма 1 мільён долараў, прыбытку ад выкарыстання фільм не атрымалі, больш за тое, пазбаўлены такога права цягам найбліжэйшай перспектывы.

Да таго ж у цяперашні час прадпрыемствы-рэзідэнты Рэспублікі Беларусь дзяржаўнай формы ўласнасці вымушаны выкупляць права пракату фільма на тэрыторыі краіны ў замежных юрыдычных асоб, якім ТАА «Маскіт» за ўзнагароджанне даверыла рэалізацыю пракату кінапрадукту.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

# Стасункам з Чарнігаўшчынай — чвэрць стагоддзя

**У ІІІ Міжнародным форуме інвестыцый і экспарту ў Чарнігаўскай вобласці ўзяла ўдзел дэлегацыя Гомельшчыны на чале са старшынёй аблвыканкама Уладзімірам Дворнікам. Удзельнікамі гэтага форуму стала каля 170 прадстаўнікоў з Украіны, Беларусі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Японіі, Кітая.**

Як паведаміла прэс-сакратар Гомельскага аблвыканкама Вольга Рабікова, гісторыя супрацоўніцтва пачалася ў 1993 годзе з падпісання дамовы паміж аблвыканкамам і Чарнігаўскай абласной адміністрацыяй.

За апошнія два гады знешнегандлёвы абарот Гомельскай вобласці з рэгіёнамі суседняй паўднёвай краіны склаў амаль $1 млрд. Гомельшчына імпартуе шпалеры, тканіны з поліэфірных валокнаў, пражу, абсталяванне да трубаправоднай арматуры і іншае. Попытам таксама карыстаюцца ўгнаенні, звадкаваны газ, жытняя мука, шкло, шакаладная прадукцыя.

У вобласці цяпер працуе 111 прадпрыемстваў з украінскім капіталам. Агульны аб'ём інвестыцый за апошнія сем гадоў склаў амаль $65 млн. Сёлета ў СЭЗ «Гомель-Ратон» зарэгістраваны новы рэзідэнт па вытворчасці электрычных печаў — з інвестыцыйным праектам на 4 млн еўра.

Сярод перспектыўных кірункаў — супрацоўніцтва ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, навуцы і турызме. Уладзімір Дворнік выказаў упэўненасць, што якасна новы імпульс адносінам дзвюх дзяржаў дасць запланаваны на кастрычнік форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны ў Гомелі. Між тым дэлегацыя Чарнігаўскай вобласці збіраецца прыняць удзел у Гомельскім эканамічным форуме 25 мая, дзе будзе актуалізавана міжрэгіянальная дамова.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ААН ЗАНЕПАКОЕНЫЯ РЭЗКІМ РОСТАМ КОЛЬКАСЦІ БЕЖАНЦАЎ З КРАІН ЦЭНТРАЛЬНАЙ АМЕРЫКІ



Упраўленне вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў адзначае рэзкі рост колькасці бежанцаў з паўночных краін Цэнтральнай Амерыкі, заявіла прэс-сакратар УВКБ Кацярына Кіцідзі. «Звыш 294 тысяч просьбітаў прытулку і бежанцаў з паўночных краін Цэнтральнай Амерыкі зарэгістраваныя па ўсім свеце ў канцы мінулага года. Гэта на 58 працэнтаў больш, чым пазалетась, і ў 16 разоў больш, чым было ў канцы 2011 года», — заявіла яна. Пры гэтым толькі ў мінулым годзе было зарэгістравана 130,5 тысячы запытаў на атрыманне статусу бежанцаў. У ААН адзначаюць, што людзі бягуць «ад гвалту і праследу», многія з іх сутыкаюцца на сваім шляху з вялікай небяспекай і цяжкасцямі.

### ІТАЛІЯ ПРАД'ЯВІЛА ЕЎРАСАЮЗУ ЎЛЬТЫМАТУМ

Новы ўрад Італіі выпусціў эканамічную праграму, у якой Еўрасаюзу выстаўлююцца пэўныя патрабаванні, а менавіта спісаць 250 мільярдаў еўра нацыянальнага доўгу, а таксама адмяніць абмежаванні па ўзроўні дзярждоўгу і дэфіцыту бюджэту, якія, на думку італьянцаў, даўно ўжо існуюць толькі на паперы, перадае РІА Навіны. У адваротным выпадку Італія гатовая адмовіцца ад еўра на карысць ліры. У чарнавым варыянце кааліцыйнага пагаднення паміж партыямі «Пяць зорак» і «Ліга Поўначы», якія набралі на выбарах 4 сакавіка найбольшую колькасць галасоў, ужо прадугледжаны канкрэтныя тэхнічныя працэдуры пераходу да нацыянальнай італьянскай валюты ў выпадку адмовы ЕС пайсці насустрач.

### ПРЭЗІДЭНТАМ НЬЮ-ЁРКСКАЙ ФОНДАВАЙ БІРЖЫ ЎПЕРШЫНЮ СТАНЕ ЖАНЧЫНА




Заўтра прэзідэнтам Нью-Ёркскай фондавай біржы (NYSE) упершыню стане жанчына. Гэтую пасаду зойме галоўны аперацыйны дырэктар біржы Стэйсі Канінгам, піша газета The Wall Street Journal са спасылкай на прадстаўніка Intercontinental Exchange Inc. (ICE) — холдынгавай кампаніі NYSE. Такім чынам, на чале біржы ўстане жанчына ўпершыню за 226 гадоў існавання NYSE. Другую па значнасці амерыканскую біржу — NASDAQ Inc. — са студзеня 2017-га таксама ўзначальвае жанчына, Адэна Фрыдман. 43-гадовая Стэйсі Канінгам — па адукацыі спецыяліст па арганізацыі прамысловай вытворчасці. Практычна ўсю сваю кар'еру яна адпрацавала ў NYSE, пачаўшы ў 1994 годзе з пасады стажора. «Я палюбіла гэтае месца з першых дзён працы і вельмі рада зараз, што буду ім кіраваць», — сказала Канінгам журналістам. Як вядома, Нью-Ёркская фондавая біржа была створана ў 1792 годзе. На ёй таргуюцца акцыі больш як чатырох тысяч кампаній.

# НЕ ТОЛЬКІ ВАЛЁНКІ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

***— Дзмітрый Уладзіміравіч, вы ўжо адчулі асаблівасць гэтых мясцін?***

— Думаю, яе адчувае кожны, хто сюды трапляе...

***— Згодная, я, напрыклад, заўважыла, што людзі тут адзін аднаму ўсміхаюцца.***

— Я нарадзіўся недалёка — у Горацкім раёне, але не думаў, што за 20 кіламетраў адтуль ёсць гэтакі незвычайны рэгіён. Мне імпануе яго спецыфіка: амаль 70 працэнтаў людзей пражывае ў сельскай мясцовасці, уся створаная інфраструктура накіравана не на раённы цэнтр, а на пасёлкі, у якія прыехалі людзі пасля чарнобыльскай трагедыі. У гэтых шасці пасёлках адбылося «змяшэнне крыві» з розных рэгіёнаў, і гэта адлюстравалася на мясцовым жыцці. Вынік перасялення, якое адбылося 30 гадоў таму, — пазітыўнае стаўленне людзей да жыцця, якое вы заўважылі.

Адчуваю гэта і па выканкаме. Бачу, як працуе апарат са зваротамі грамадзян, як адбываецца справаводства, наколькі адточана выканаўчая дысцыпліна. Тут працуе згуртаваная каманда, створаны эфектыўны механізм кіравання.

Адна з маіх задач — рэалізацыя дзяржаўнай кадравай палітыкі, таму ў першую чаргу звярнуў увагу на кіраўнікоў арганізацый, прадпрыемстваў. На сёння раён укамплектаваны кіраўнікамі сельгаспрадпрыемстваў. Мы своечасова адсеяліся, ішлі ў ліку першых шасці рэгіёнаў па тэмпах пасяўной кампаніі, хоць і не знаходзімся на поўдні. Перспектывы і магчымасці ў раёна ёсць.

***— А ініцыятыва?***

— З гэтым больш складана, і не толькі на Дрыбіншчыне. Энергічная моладзь мігрыруе ў цэнтры, якія даюць найбольшыя магчымасці для раскрыцця патэнцыялу. Але мы таксама імкнёмся стварыць магчымасці. Па ініцыятыве старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова ў трох раёнах (Горацкім, Мсціслаўскім і Дрыбінскім) створаны рабочыя групы, якія ўзначалілі прарэктары сельгасакадэміі. Нашу групу курыруе Юрый Цібец, які з камандай эканамістаў і тэхнолагаў дапамагае рэалізоўваць новыя ідэі.

Разам з вучонымі працуем па двух напрамках. Першы — абапіраючыся на базу, якую маем, імкнёмся атрымаць і найбольш выгадна прадаць таварную прадукцыю, другі — шукаем новыя шляхі развіцця раёна, новыя раслінныя культуры для вырошчвання, новыя тэхналогіі ў кармленні жывёл, новыя падыходы ў профілі гаспадарак, каб атрымаць больш аддачы. Не сядзім на месцы, чытаем прэсу, звяртаем увагу на станоўчы вопыт, пра які ёсць інфармацыя ў інтэрнэце, і ўсё самае лепшае гатовы выкарыстаць тут.



Фота БелТА.

**Фестываль «Дрыбінскія таржкі», які праходзіць у райцэнтры ў жніўні, за сем гадоў сваёй гісторыі стаў візітоўкай не толькі раёна, але і ўсёй Магілёўскай вобласці.**

**«Амаль 70 працэнтаў людзей пражывае ў сельскай мясцовасці, уся створаная інфраструктура накіравана не на раённы цэнтр, а на пасёлкі, у якія прыехалі людзі пасля чарнобыльскай трагедыі».**

Сёлета павінны завяршыцца жывёлагадоўчыя комплексы ў «Трылесіна-агра» і «Дрыбін-агра». У выніку павялічацца пагалоўе буйной рагатай жывёлы, надоі малака. Шэсць сянажна-сіласных траншэй па дзве тысячы тоны кожная паспрыяюць павышэнню якасці кармоў, а значыць, паляпшэнню здароўя жывёл. База на сельгаспрадпрыемствах раёна неблагая, ёсць і людзі. Поспех залежыць ад скаардынаванасці іх працы.

***— Раён галоўным чынам забяспечае сыравінай магілёўскую кампанію «Бабуліна крынка»?***

— Так, наш рэгіён — сыравінная зона «Бабулінай крынкі». Рэалізацыя на 100 % ідзе туды.

***— Ці ёсць сэнс ствараць уласную вытворчасць тых жа малочных прадуктаў?***

— Магчымасці маюцца, але мэтазгоднасць неабходна дасканала пралічаваць.

***— Добра развітае фермерства — гэта таксама асаблівасць Дрыбінскага раёна.***

— Тут сфарміравалася своеасаблівая эксперыментальная пляцоўка. У канцы 90-х гадоў некалькі дрыбінскіх сельскагаспадарчых кааператываў змянілі форму ўласнасці і набылі статус фермерскіх гаспадарак. У структуры мясцовых падаткаў на сённяшні дзень на 100 гектараў сельгасугоддзяў паступленні ад фермераў удвая большыя, чым ад дзяржаўных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

***— Якія ў мясцовай улады ўзаемаадносіны з фермерамі?***

— Мы добра кантактуем. Абменьваемся вопытам, у некаторых выпадках вучымся ў фермераў рэалізоўваць прадукцыю, нарыхтоўваць сянаж. На базе паспяховай фермерскай гаспадаркі зімой правялі семінар з удзелам кіраўнікоў сельгаскааператываў. У выніку ўнеслі карэкціроўкі ў структуру пасеваў, дадаткова пасеялі канюшыну. Большасць нашых фермераў спецыялізуецца ў раслінаводстве, але ёсць і тыя, хто паспяхова займаецца жывёлагадоўляй: браты Аляксандр і Уладзімір Рынгі, Уладзімір Цмугуноў.

Увогуле, дрыбінскі фермер сёння самастойны. Яму цікавы і важны гэты раён, небаякава тое, што тут адбываецца. Мы працуем разам. Ён стварае працоўныя месцы, плаціць падаткі, мае попыт на сваю прадукцыю.

Адзін з нашых фермераў — Уладзімір Цмугуноў — сёлета з рук кіраўніка дзяржавы атрымаў медаль «За працоўныя заслугі». Гэты чалавек у сельскай гаспадарцы ўсё жыццё. А тыя, хто працуе на зямлі, заслужылі залічэнне ў працоўны стаж год за тры: штодня складаная работа і вялікія клопаты з досвітку да поўначы. Мы такіх людзей цэнім і шануем.

***— З прадпрымальнікамі як працуеце?***

— Сумленна. На даваральных адносінах. Мы пакуль адзіны раён у вобласці, які не працаваў з кампаніяй «Еўрагандаль», але гатовыя да супрацоўніцтва. Разам з тым у нас моцнае спажывецкае таварыства, сетка якога шырока прадстаўлена і ў райцэнтры, і ў сельскай мясцовасці. Плануецца праз два-тры месяцы запусціць цэх па вытворчасці мясных паўфабрыкатаў на экспарт. Гэта забяспечыць прыход валюты. Сыравінная база ў нас дастатковая.


Фота Людмілы СВЫРЫДЗЕНКІ.

**Дынастыя хлебаробаў ГУРКОВЫХ з ТАА «Трылесіна-агра»: Бацька Аляксандр і сыны Антон і Андрэй.**

***— Што вы самі са свайго папярэдняга вопыту лічыце самым каштоўным для пасады старшыні райвыканкама?***

— Напэўна, усё. Маё першае працоўнае месца — старшыня прафкама Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. Гэта работа з пяццю тысячамі ініцыятыўных і творчых чалавек, якія жывуць надзённымі праблемамі. Яны не пішуць праграмы на пяць гадоў наперад, але крэатыўна мысляць, умомант прымаюць рашэнні і рухаюцца наперад. Гэты вопыт мне дапамагае жыць і працаваць. На планёрках, у зносінах з працоўнымі калектывамі я заўсёды памятаю, што жыццё — адно, і рашэнне — аператыўнае і правільнае — павінна быць прынятае зараз. Адказнасць пры гэтым вялізная, і трэба ўлічыць усе магчымыя наступствы. Таму для мяне важна ўсё.

Вельмі значным, хоць і нядоўгім, быў вопыт работы ў вучэбнай гаспадарцы БДСГА пад кіраўніцтвам Мікалая Блахіна. Заўсёды буду ўдзячны гэтаму чалавеку, кіраўніку ад Бога, таленавітаму стратэгу, які выхаваў многіх прафесіяналаў сваёй справы.

Мне пашчасціла працаваць на пасадзе першага намесніка старшыні Круглянскага райвыканкама Анатоля Шчуплянкова, які стаў настаўнікам у рабоце з кадрамі. Сама каманда, з якой давялося працаваць, многаму навучыла. Мы стварылі дзейсную машыну кіравання сельскай гаспадаркай. Мне не сорамна за зробленае там. Цяпер выкарыстоўваю гэты вопыт тут.

***— У вас ёсць мара, звязаная з новай пасадай?***

— Можна было б адказаць, што мая мара — каб усе жыхары Дрыбіншчыны былі шчаслівыя, атрымлівалі добрыя заробкі... Але гэта ніяк не звязана з паўнамоцтвамі, якія мае кіраўнік раёна. Шчасце людзей залежыць ад іх саміх. У жыцці кожнага чалавека бывае няпросты перыяд, і кожны з нас увесь час робіць выбар: вучыцца або не, працаваць або не, вырашаць праблему або не, у які бок рухацца, зрабіць сваю справу найлепшым чынам ці абы-як. Мы самі прымаем рашэнні, бяром адказнасць за сваё жыццё. І я кажу людзям зараз: не варта на некага скардзіцца, чакаць чараўніка, давайце самі зробім сваё жыццё лепшым.

Улада не можа быць добрай для ўсіх, яна павінна быць справядлівай. Сёння мы падтрымліваем шматдзетныя сем'і, сірот... Плануем пачаць будаўніцтва 32-кватэрнага дома для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. На гэтым шляху мы не павінны спыняцца. Будаўніцтва дома падштурхне работу нашых прыватнікаў: вытворцаў мэблі, прадаўцоў бытавой тэхнікі, будаўнічых матэрыялаў. Мы нацэлены на здаровую канкурэнцыю і рынкавую эканоміку.

Акрамя іншага, раёну патрэбна сучасная кіназала. На наступны год прыпадае некалькі юбілейных дат: 30 гадоў пасля трэцяга ўтварэння раёна і 450 гадоў Дрыбіну. Мы хацелі б да гэтага годна падрыхтавацца. Планаў шмат: і разбіўка новага сквера, і знос старых пустых будынкаў...

Дрыбінскі раён невялікі, і на нас глядзяць: ці здольныя мы быць самастойнымі? Я ўпэўнены, што здольныя.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
*г. п. Дрыбін.*



**Адна з самых маляўнічых і любімых мясцін жыхароў раёна — помнік прыроды «Грымячая крыніца» каля вёскі Расна.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
24 МАЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 10 (15841)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года



Ганна ШАЛЮЦІНА:

# «ШЧАСЦЕ — ГЭТА АДБЫЦЦА Ў ПРАФЕСІІ»

**Мы сустрэліся за дзень да яе першага сольнага канцэрта «Песні любімага кіно». Пазней яна прызнаецца ў размове, што не хвалявалася, але адчувала адказнасць. Пра тое, чаму двойчы адкладала «сольнік», як палюбіць сябе з усімі недахопамі і што рабіць, калі раніца не задалася, а трэба будзіць цэлую краіну, спявачка, радыё- і тэлевядучая праграмы «Наша раніца» на тэлеканале АНТ Ганна Шалюціна расказала «Чырвонцы. Чырвонай змене».**

***— Кім марылі стаць у дзяцінстве? Ці спраўдзілася мара?***

— Я ніколі не казала: «Хачу быць артысткай». Гэта было зразумела: ні настаўнікам, ні праграмістам, ні касманаўтам — артысткай. Я любіла спяваць і выступаць на публіцы, нават калі збірала яе сабе сама: рассаджвала вакол лялек і гадзінамі ім нешта расказвала.

***— Ці памятаеце свой самы першы кастынг?***

— У дзяцінстве я ўдзельнічала ў шматлікіх конкурсах. Вельмі іх, дарэчы, не любіла, таму што жудасна хвалявалася. І менавіта тады я дакладна зразумела: хлопчык, які спявае, выглядае больш выйгрышна, чым дзяўчынка. Чаму? Таму што хлопчыкаў на конкурсах значна менш. І калі ён спявае сапраўды добра, то, вядома, прыцягвае да сябе ўвагу. З вялікай доляй імавернасці ён пераможа.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*Лесвіца поспеху*

# АРЫГІНАЛЬНАСЦЬ, КРЭАТЫЎНАСЦЬ І ІНІЦЫЯТЫЎНАСЦЬ

## Чаму быць сярэднім спецыялістам эканамічна нявыгадна?

**Прафесар Джон Хокінс, аўтар сусветнага бестселера «Крэатыўная эканоміка. Як пераўтварыць ідэі ў грошы», сцвярджае, што каштоўнасць эканамічных сістэм сёння залежыць не ад такіх традыцыйных рэсурсаў, як зямля, праца і капітал, а ад ініцыятыўнасці, арыгінальнасці і крэатыўнасці. Крэатыўная эканоміка будзе галоўнай формай эканомікі ў XXI стагоддзі. Грамадству патрабуюцца творчыя асобы, таму ўсім трэба развіваць у сабе менавіта тыя навыкі, якія выгадна адрозніваюць нас ад штучнага інтэлекту, каб у канкурэнцыі з машынамі не саступіць апошнім.**

**Універсальныя кампетэнцыі XXI стагоддзя сталі тэмай адкрытай лекцыі, якая прайшла ў Беларускім дзяржаўным універсітэце пры поўным аншлагу. Аўдыторыя ледзь змагла змясціць усіх ахвотных. Спікерам выступіла загадчык кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ, доктар педагагічных навук, прафесар Вольга ЖУК, якая цалкам паглыбіла студэнтаў у праблему. А дацэнт той жа кафедры, кандыдат педагагічных навук Святлана СІРЭНКА правяла міні-трэнінг, які дазволіў удзельнікам засвоіць некаторыя тэхнікі развіцця творчых здольнасцяў.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



*Свой стыль*

# КАЛІ ТВОЙ ТРЭНЕР — КАРАЛЕВА, ЯКАЯ ХОЧА ЎСЯГО І АДРАЗУ

**«Гэты конкурс дапамог мне паверыць у сябе», — прызнаецца Марыя САЛАЎЁВА, сёлетняя «Каралева Вясна». Другакурсніца Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава змагла абысці дзесяць прыгажунь з іншых абласцей і сталіцы і заваяваць карону на спаборніцтве па грацыі і артыстычным майстэрстве, якое штогод арганізуе БРСМ і Нацыянальная школа прыгажосці пры падтрымцы Міністэрства адукацыі. Дзяўчына расказала, чым захапляецца, як ёй удаецца трымаць сябе ў форме і якую літаратуру яна чытае.**



Фота Марыі БЕЛІКАВАЙ.

Марыя вучыцца на спецыяльнасці «рамана-германская філалогія». Адточвае англійскую і нямецкую мовы.

— Хацелася навучыцца прыгожа гаварыць і думаць, — тлумачыць суразмоўніца, чаму выбрала гэты профіль. — Да таго ж мне вельмі па душы літаратура і мовы.

Але быць перакладчыкам пасля заканчэння ўніверсітэта Марыя не збіраецца. Ужо цяпер яна працуе трэнерам па бальных танцах і хоча звязаць сваё жыццё з гэтай прафесіяй. Танцамі дзяўчына займаецца з чатырох гадоў. Найбольш ёй падабаецца румба — танец кахання.

Графік у другакурсніцы вельмі шчыльны. У першай палове дня — пары ва ўніверсітэце, у другой — трэніроўкі. Працоўны дзень Марыі доўжыцца прыкладна з трох да дзесяці гадзін, а па выхадных яна з дзецьмі рэгулярна выязджае на турніры. Нядаўна вось была ў Маскве на міжнародных спаборніцтвах.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
24 05 2018 г.

# АРЫГІНАЛЬНАСЦЬ, КРЭАТЫЎНАСЦЬ І ІНІЦЫЯТЫЎНАСЦЬ



**Адкрытая лекцыя прайшла пры поўным аншлагу. Аўдыторыя ледзь змагла змясціць усіх ахвотных.**

## КАБ НЕ СТАЦЬ ЛІШНІМІ...

— Інтэрнэт рэчаў, аўтаномныя электрамабілі, дроны, робаты, індывідуальныя лекі, створаныя на падставе аналізу ДНК, альтэрнатыўныя крыніцы энергіі, «разумныя гарады»... Усё гэта ўжо сённяшні дзень. Ва ўмовах лічбавай рэвалюцыі рынак працы змяняецца кардынальна, а многія прафесіі знікаюць назаўсёды, — падкрэслівае Вольга Жук. — Эксперты 46-га Сусветнага эканамічнага форуму ў Давосе ў 2016 годзе паведамілі, што на працягу найбліжэйшых дзесяці гадоў у пятнаццаці найбольш развітых краінах Еўропы колькасць рабочых зменшыцца на 5 мільёнаў. А на думку экспертаў Маскоўскай школы эканомікі, да 2040 года ад адной трэці да паловы рабочых месцаў у прамыслова развітых краінах будуць запоўнены камп'ютарнымі праграмамі і робатызаванымі рашэннямі.

Чацвёртая прамысловая рэвалюцыя і крэатыўная эканоміка ўзмацняюць няроўнасць паміж людзьмі. Але, на думку вядомага эксперта Германа Грэфа, актуалізуюцца супярэчнасці не паміж багатымі і беднымі, а паміж людзьмі з высокаразвітымі кампетэнцыямі, прафесіяналамі высокага класа — з аднаго боку, і сярэднімі спецыялістамі — з другога. Прасцей кажучы, быць сярэднім студэнтам, сярэднім выпускніком, сярэднім спецыялістам становіцца эканамічна нявыгадна.

Да таго ж шырокае прымяненне штучнага інтэлекту і робатаў цягне за сабой з'яўленне новага класа людзей, якіх называюць бескарыснымі ці лішнімі. Паводле даследавання Эрыка Хёрста, эканаміста з Чыкагскага ўніверсітэта, 22 мільёны маладых амерыканскіх мужчын без вышэйшай адукацыі не працавалі ў 2017 годзе ні аднаго дня. Пры гэтым 7 мільёнаў беспрацоўных нават не рабілі спробы знайсці сабе працу. Але чым жа яны займаюцца? Большую частку свайго часу бавяць за відэагульнямі...

Ёсць прагнозы, паводле якіх да 2050 года ва ўмовах робатызацыі рабочы дзень для людзей з вышэйшай адукацыяй скароціцца да трох гадзін. І ўзнікае няпростае пытанне: чым жа будзе заняты чалавек у сярэдзіне XXI стагоддзя? Няўжо ён цалкам паглыбіцца ў віртуальны свет?

**Арыгінальнасць і крэатыўнасць стануць асноўнымі крытэрыямі ацэньвання адукацыйных вынікаў студэнтаў.**



**Вольга Жук: «Інтэлектуальныя здольнасці і сіла волі падобныя да мышцаў».**

«Мяркую, адказ на яго ў многім залежыць ад патрэбы кожнага з нас у асабістым росце, у развіцці ў сабе крэатыўнасці, гатоўнасці займацца разнапланавай, карыснай, творчай работай, стваральнай і дабрачыннай дзейнасцю, — разважае Вольга Жук. — Гэта сапраўдны выклік і сістэме адукацыі, і ўсім нам. Як спраектаваць свой асобасны і кар'ерны рост ва ўмовах нявызначанасці, калі пра будучыню яшчэ мала што вядома? Як універсітэту рыхтаваць канкурэнтаздольных выпускнікоў? Невыпадкова сёння спрабуюць сфармуляваць не толькі глабальныя выклікі сучаснасці, але і ўніверсальныя кампетэнцыі, якія дапамогуць нам усім адаптавацца да сітуацыі, якая імкліва змяняецца».

## БОЛЬШ, ЧЫМ ПРОСТА ВЕДЫ

Адзін з выклікаў — адсутнасць ва ўмовах пастаянных змяненняў гатовых рашэнняў і «рэцэптаў». Патрэбныя навыкі — крытычнае і крэатыўнае мысленне, уменне самастойна распрацоўваць новыя метады рашэння праблем (у залежнасці ад умоў), веданне прынцыпаў і падыходаў, якія ляжаць у аснове прыняцця рашэнняў. Не менш сур'ёзныя выклікі — лічбавая рэвалюцыя і размыванне межаў паміж прафесійнымі галінамі. Каб арыентавацца ў вялізным інфармацыйным свеце, трэба валодаць лічбавай адукаванасцю. Патрабуюцца два ўменні. Першае — ажыццяўляць пошук інфармацыі, уменне яе аналізаваць. І другое, самае галоўнае, — уменне выбудоўваць сувязі паміж здабытай інфармацыяй і атрыманымі раней ведамі і ўбудоўваць новую інфармацыю ў задачы і праблемы, што ўзнікаюць. Сёння каштоўнасць мае не фактычная інфармацыя, якую лёгка можна знайсці ў інтэрнэце. Запатрабаванымі становяцца глабальная дасведчанасць і фундаментальная падрыхтоўка, заснаваная на навуковых тэарэтычных кампанентах. Яны забяспечваюць разуменне прынцыпаў уладкавання і ўзаемадзеяння паміж прыродай і чалавекам, грамадствам і эканомікай, таму спецыялістам патрабуюцца навыкі міжгаліновай камунікацыі, работы ў міждысцыплінарных камандах, у праектнай дзейнасці на стыку галін.

Дык якім жа чынам можна спраектаваць свой уласны адукацыйны маршрут, каб забяспечыць развіццё ў сабе кампетэнцый XXI стагоддзя?

**— Кампетэнцыі — гэта больш, чым проста веды і ўменні,** — тлумачыць Вольга Жук. — Гэта ўменні і веды плюс псіхасацыяльныя асобасныя якасці, звязаныя з адказнасцю за тое, што мы ведаем і ўмеем прымяняць на практыцы.

Існуюць розныя пералікі ўніверсальных кампетэнцый, неабходныя тым, хто хоча заставацца ў XXI стагоддзі ў трэндзе (больш лаканічныя і, наадварот, максімальна пашыраныя). Напрыклад, пералік, сфарміраваны на Давоскім эканамічным форуме, уключае 10 пунктаў: уменне вырашаць комплексныя задачы, крытычнае мысленне, крэатыўнасць, уменне кіраваць чалавечымі рэсурсамі, узаемадзейнічаць з іншымі людзьмі, эмацыянальны інтэлект, адказнасць за прынятыя рашэнні, арыентацыя на сферу паслуг, уменне весці перагаворы, акадэмічную гнуткасць.

На думку амерыканскіх экспертаў, на першае месца выходзяць камунікатыўныя здольнасці, навыкі вырашэння праблем, уменне працаваць у камандзе, захаванне карпарацыйнай этыкі, лідарскія якасці, ініцыятыўнасць, аналітычныя здольнасці, гнуткасць і здольнасць адаптавацца, навыкі міжасабовых стасункаў, тэхнічныя навыкі, навыкі стратэгічнага планавання, крэатыўнасць і прадпрымальніцкія здольнасці.



**Святлана Сірэнка: «Ствараем веер канцэпцый. Ваш сусед зверху слухае гучную музыку. Што мы можам зрабіць?»**

## А ШТО Ў ДЭФІЦЫЦЕ?

Вольга Жук паведаміла, што восем беларускіх устаноў вышэйшай адукацыі з'яўляюцца ўдзельнікамі міжнароднага праекта «Садзейнічанне развіццю кампетэнцый у беларускай вышэйшай адукацыі» ў рамках праграмы Эразмус+. Разам з імі ў праекце ўдзельнічаюць ВНУ-партнёры з Іспаніі, Літвы, Польшчы і Фінляндыі. Эксперты з гэтых краін сфармулявалі 24 ключавыя кампетэнцыі. Акрамя вышэйзгаданых пералік уключае таксама тайм-менеджмент (уменне эфектыўна кіраваць сваім часам), здольнасць прадбачыць новыя праблемы, працаваць пад ціскам (стрэсаўстойлівасць), адкрытасць для новых прафесійных магчымасцяў, разуменне складаных праблем у цэлым, здольнасць даступна тлумачыць свае ідэі, мабілізоўваць патэнцыял іншых, хутка набываць новыя веды, браць пад сумненне існуючыя ідэі, прэзентаваць прадукт, ідэі ці справаздачы на публіцы і іншыя.

**«Як спраектаваць свой асобасны і кар'ерны рост ва ўмовах нявызначанасці, калі пра будучыню яшчэ мала што вядома?»**

З кастрычніка 2017-га па студзень бягучага года ў нашай краіне праводзілася комплекснае анкетаванне выпускнікоў, выкладчыкаў універсітэтаў і работадаўцаў. Яго вынікі дазваляюць ацаніць, наколькі ўніверсітэцкая адукацыя садзейнічае развіццю кампетэнцый і наколькі адрозніваюцца меркаванні выпускнікоў, выкладчыкаў і работадаўцаў наконт таго, якіх жа кампетэнцый не хапае нядаўнім студэнтам (а іх меркаванні не заўсёды супадаюць). Высветлілася, напрыклад, што да дэфіцытных кампетэнцый адносяцца ўменне прымаць рашэнні ва ўмовах нявызначанасці, эфектыўна весці перагаворы, прыстасоўвацца да змяненняў, размяркоўваць свой час, прадбачыць новыя праблемы, стрэсаўстойлівасць, уменне планаваць, арганізоўваць і каардынаваць дзейнасць, адкрытасць для новых магчымасцяў, разуменне праблем у цэлым, уменне сістэматызаваць і абагульняць. На думку наймальнікаў, моцна «кульгае», калі не сказаць больш жорстка — адсутнічае, веданне замежных моў, таксама ў выпускнікоў бракуе лідарскіх якасцяў.

## СМАРТФОН — СУПРАЦЬ ВЫКЛАДЧЫКА

**— Фарміраванне ўніверсальных кампетэнцый — не толькі задача сістэмы адукацыі, а сфера адказнасці кожнага з нас за свае адукацыйныя вынікі,** — упэўнена Вольга Жук. — Эксперты трох сусветных карпарацый па стварэнні штучнага інтэлекту (Google, Microsoft і IBM) прагназуюць, што засталося сем гадоў да знікнення папяровых падручнікаў. Між іншым, смартфоны са штучным інтэлектам стануць даступныя для ўсіх. Натуральна, што ўсё гэта зменіць характар узаемадзеяння выкладчыкаў і студэнтаў, а таксама важнасць і каштоўнасць вучэбна-даследчай дзейнасці. Выкладчык ужо не зможа быць упэўненым у тым, хто вырашыў задачу: студэнт ці яго смартфон? Гэта азначае, што традыцыйныя метадыкі, у якіх не менш як 50 працэнтаў займае кантрольна-ацэначная дзейнасць, сыдуць у мінулае.

У такім выпадку якія ж методыкі будуць запатрабаваныя? На думку загадчыка кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ, сёння ўзрастае актуальнасць праблемнага навучання, эўрыстычнага, праектнага, перакуленага навучання, творчай работы ў мабільных камандах. Пры гэтым арыгінальнасць і крэатыўнасць стануць асноўнымі крытэрыямі ацэньвання адукацыйных вынікаў студэнтаў.

Вольга Жук абнадзейвае моладзь: «Інтэлектуальныя здольнасці і сіла волі падобныя да мышцаў: чым больш актыўна іх выкарыстоўваеш, тым больш моцнымі і трывалымі яны становяцца. Таму трэніруйцеся...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### ❍ Даведка

**Цыкл адкрытых лекцый стартаваў у БДУ ў снежні 2017 года. Праект накіраваны на ўдасканаленне ведаў у студэнтаў, а таксама пашырэнне іх кругагляду і павышэнне матывацыі да вывучэння гуманітарных і прыродазнаўчых дысцыплін. Лекцыі не патрабуюць спецыяльнай папярэдняй падрыхтоўкі слухачоў. Акрамя таго, тэмы выступленняў і спікераў вызначаюць самі студэнты ў залежнасці ад сваіх навуковых інтарэсаў. Для гэтага ім прапануецца пакінуць свае пажаданні, запоўніўшы анкету анлайн. Ідэя правядзення навукова-адукацыйных сустрэч належыць упраўленню па выхаваўчай рабоце з моладдзю БДУ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Геаграфія руху

# Студатрады чакаюць ад Польшчы да Казахстана

**Гэтым летам беларускія студэнты будуць шчыраваць у складзе студатрадаў не толькі на радзіме. Два з іх, на 60 чалавек, адпраўяцца на ўборку ўраджаю ў Малдову, будаўнічы — у Краснаярск, сэрвісныя і педагагічныя — у Краснадарскі край, сельскагаспадарчыя — у Падмаскоўе, будаўнічы і сельскагаспадарчы — у Польшчу.**



Па словах **камандзіра Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў ЦК БРСМ Надзеі ШАХОЎСКАЙ,** плануецца таксама аднавіць супрацоўніцтва з Казахстанам. Гэта будзе сімвалічна, таму што сёлета спаўняецца 55 гадоў з зараджэння ў Беларусі студатрадаўскага руху. У 1963 годзе ва Уральскую вобласць Казахстана выехалі 2,5 тысячы беларускіх студэнтаў з 15 ВНУ. Працоўны семестр для іх доўжыўся 70 дзён. Шэраг мерапрыемстваў будзе прымеркаваны менавіта да гэтай даты.

У краіне ўжо стартавалі акцыі БРСМ «Труд — крут!» і «Выбіраем студатрад!». Моладзь актыўна запісваецца ва ўсіх рэгіёнах у апошнія. А **самыя мэтанакіраваныя студэнты пачалі прыносіць заяўкі ў штабы працоўных спраў яшчэ зімой... І гэта не дзіўна, бо ў многія студатрады складваецца сур'ёзны конкурс. Хто ж адмовіцца адначасова і адпачыць, і падзарабіць, і пагладзець суседнюю краіну?** Напрыклад, каб трапіць на Усебеларускую маладзёжную будоўлю на Беларускую АЭС, трэба ўжо мець вопыт работы ў студатрадзе, добрае здароўе і не менш як трэці разрад па любой будаўнічай спецыяльнасці. Па традыцыі будзе працаваць тут і беларуска-расійскі студатрад. Дарэчы, самы высокі заробак падчас трэцяга працоўнага семестра быў летась менавіта ў Астраўцы — ён даходзіў да 1,5 тысячы рублёў за два месяцы напружанай працы.

Масава студэнты і навучэнцы прыступяць да працы ў складзе студэнцкіх атрадаў пасля заканчэння летняй сесіі. «Для маладых людзей таксама прапануюцца сезонныя работы ў верасні — лістападзе, — паведаміла Надзея Шахоўская. — Між іншым, у студэнцкія атрады могуць уключацца і падлеткі ва ўзросце ад 14 гадоў. Самыя юныя ўдзельнікі студатрадаўскага руху працуюць не больш за чатыры гадзіны ў дзень. У непаўналетніх попытам карыстаюцца сельскагаспадарчыя атрады, вытворчыя і экалагічныя. Летась студатрадаўскім рухам былі ахоплены больш як 21,2 тысячы чалавек. Мяркуецца, што ў гэтым годзе будзе працаўладкавана не менш маладых людзей».

Але працаваць летам падлеткі могуць не толькі ў складзе студэнцкіх брыгад. Службы занятасці прапануюць хлопцам і дзяўчатам займацца азеляненнем і добраўпарадкаваннем тэрыторыі, рамонтам мэблі і кніг у школах.

— Часовае працаўладкаванне моладзі арганізуецца ва ўсіх рэгіёнах краіны. Гэта вельмі важны аспект выхавання і прафілактыкі правапарушэнняў, — падкрэслівае **кансультант упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацабароны Жанна ШЧАМЯЛЁВА.** — Сёлета памер фінансавання на арганізацыю занятасці моладзі павялічаны на 10 працэнтаў у параўнанні з 2017 годам. У мінулым годзе планавалася працаўладкаваць 24 тысячы падлеткаў, а ў выніку забяспечылі працай 29 тысяч. Мяркую, у гэтым годзе таксама будзе працаўладкавана больш навучэнцаў, чым плануецца.

Пры ўмове, што падлеткі адпрацуюць цэлы месяц, яны могуць разлічваць на мінімальны заробак — 305 рублёў. Але пры гэтым трэба мець на ўвазе, што яны працуюць няпоўны працоўны дзень. Моладзі прапануецца ў асноўным некваліфікаваная праца — азеляненне, добраўпарадкаванне ўстаноў адукацыі, рэстаўрацыя бібліятэчнага фонду, выраб сувеніраў, пашыў швейных вырабаў, вырошчванне сельгаспрадукцыі. У сталіцы вялікім попытам у падлеткаў карыстаецца праца ў заапарку. Можна таксама паспрабаваць уладкавацца членам брыгады хуткага абслугоўвання ў рэстаран «Лідо». Увогуле для навучэнскай моладзі ў Мінску прапануецца каля 500 вакансій. Чакаецца, што просьбу падшукаць для іх працоўнае месца выкажуць больш як 4 тысячы чалавек.

Існуе некалькі спосабаў паспрабаваць знайсці для сябе на лета падпрацоўку. Па-першае, школьнікам можна звярнуцца да намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце і агучыць сваё жаданне. Яму павінны падказаць, у якой установе адукацыі будзе дзейнічаць лагер працы і адпачынку. Другі спосаб — звярнуцца ў аддзел абслугоўвання службы занятасці па месцы жыхарства. Трэці — пацікавіцца магчымасцю працаўладкавацца ў студатрад у штабе працоўных спраў ВНУ, у раённым ці абласным штабе працоўных спраў БРСМ. Пры наяўнасці вакантных месцаў школьнікам там не павінны адмовіць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Апошні званок

# Дзякуй, школа, за жыццёвыя ўрокі!

**Школа... Слова, якое прасякнута любоўю, цеплынёй, утульнасцю, дзіцячым смехам... Яна дапамагае знайсці сапраўдных сяброў, дае веды, якія спатрэбяцца ў дарослым жыцці. Хутка мне і маім аднакласнікам прыйдзецца развітацца са школай, таму надышоў час падводзіць вынікі. Чаму яна навучыла нас? За адзінаццаць гадоў з класам здаралася столькі цікавых выпадкаў! А яшчэ мы атрымалі шмат жыццёвых урокаў: любіць прыроду, паважаць дарослых, дапамагаць бліжняму (калі ў цябе і твайго аднакласніка аднолькавы варыянт кантрольнай работы) і іншаму. З урокам «дапамога бліжняму» я пазнаёмілася ўжо ў першым класе дзякуючы маёй любімай настаўніцы Людміле Іванаўне.**

Быў урок літаратуры. Мы чыталі цудоўную казку Х. К. Андэрсэна «Брыдкае качаня». З яе можна было зрабіць выснову: трэба быць моцнымі, ісці да сваёй мэты, не слухаючы, што кажуць астатнія, не крыўдзіць слабейшых, а, наадварот, дапамагаць ім у цяжкія моманты жыцця.

На жаль, гэты ўрок засвоілі не ўсе мае аднакласнікі. Ужо на наступным перапынку дзеці вырашылі пажартаваць над Уладам. Ён быў самы маленькі і слабы і не мог пастаяць за сябе, але быў вельмі добры. Школьнікі ўзялі ў хлапчука гальштук і пачалі кідаць адзін аднаму. Улад спрабаваў даскочыць, схапіць яго, але нічога не атрымлівалася. Калі гальштук трапіў у мае далоні, я вырашыла спыніць гульню і вярнула рэч уладальніку.

Увесь гэты час за намі назірала Людміла Іванаўна. Яна падышла і сказала: «Памятаеце, аб чым казка, якую мы чыталі на папярэднім уроку? Толькі што вы яе праінсцэніравалі. Улад быў брыдкім качанём, усе вы — птушыным дваром, а Кацярына — качкай, якая абараніла качаня». Усім дзецям стала сорамна, і яны вынеслі галоўны ўрок з гэтай абразлівай гульні — заўсёды, пры любых абставінах, заставацца чалавекам. Трэба жартаваць так, каб было смешна, а не крыўдна. А Уладзік і на самай справе з «брыдкага качаняці» ператварыўся ў прыгожага, моцнага, шчаслівага «лебедзя». Зараз ён на другім курсе Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. І. Глінкі. Іграе на балалайцы, ставіць новыя мэты і дасягае іх. Вось такі зусім не дзіцячы жыццёвы ўрок я і мае аднакласнікі атрымалі шмат гадоў таму.

Магчыма, вы запытаецеся: «Кацярына, ты і «нездавальняюча» ніколі не атрымлівала? І заўваг за дрэнныя паводзіны не было? І вясной з урокаў не ўцякала? І дзённік ад бацькоў з адзнакамі не хавала? І кнопкі на крэсла настаўніцам не клала?» Так, без гэтага сваё школьнае жыццё я не ўяўляю. Хаця, папраўдзе, да кнопак на крэсле справа не даходзіла. Спадзяюся, што ў ВНУ такіх свавольстваў ужо не будзе. З упэўненасцю скажу, што школа шмат зрабіла для таго, каб у дарослае жыццё я ўвайшла добрым чалавекам. Родная школа, дзякуй табе за ўсё!

**Кацярына ЯРАШЭВІЧ,**
**вучаніца 11 класа СШ № 121 г. Мінска.**

# КАЛІ ТВОЙ ТРЭНЕР — КАРАЛЕВА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Як дзяўчыне ўдаецца ўсё паспяваць? «Усе такое пытанне задаюць, — усміхаецца яна. — Я прывыкла. Калі вучылася ў школе, сумяшчала з урокамі заняткі па выяўленчым мастацтве, танцавальную секцыю і музычную школу. А яшчэ ў дзяцінстве хадзіла на плаванне і захаплялася конным спортам. Мне хацелася ўсяго і адразу. Самае галоўнае — каб было жаданне. Калі ты сапраўды любіш тое, чым займаешся, размеркаваць свой час проста».

Паўдзельнічаць у конкурсе «Каралева Вясна» Марыя вырашыла спантанна. Другакурсніца, за плячыма якой не адзін танцавальны і музычны конкурс, падумала: чаму б і не? Да гэтага, дарэчы, Марыя перамагла на «Міс ВДУ». Але ўсё роўна старанна рыхтавалася да спаборніцтва: наведвала ўрокі па дэфіле, акцёрскім майстэрстве.

— Вядома, вельмі спадзявалася на перамогу, — не хавае дзяўчына. — Думаю, кожная хацела б стаць першай у рэспубліканскім конкурсе.

На інтэлектуальным этапе ўдзельніцам трэба было прыдумаць новы брэнд для краіны. Марыя прапанавала выпускаць экалагічна чыстыя ўпакоўкі для прысмакаў. На яе думку, такі ход дапаможа зменшыць шкодны ўплыў на навакольнае асяроддзе і дзеці з маленства будуць вучыцца клапаціцца аб экалогіі.



Фота Марыі БЕЛІКАВАЙ.

«Каралева Вясна» запомнілася гледачам і арыгінальным творчым нумарам. Дзяўчына вальсавала пад верш Максіма Багдановіча «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...».

— Вельмі люблю паэзію, — прызнаецца суразмоўніца. — І беларуская мова мне падабаецца: яна мілагучная. Увогуле чытаю шмат. Ва ўніверсітэце аб'ёмная праграма па літаратуры. Але на кнігі «для сябе» не хапае часу. Калі вучылася ў школе, любіла сучасных пісьменнікаў, а цяпер душа больш ляжыць да класікі. Напрыклад, падабаюцца п'есы Мальера.

У дзяўчыны ідэальная фігура. Просім падзяліцца яе сакрэтам зграбнасці. Марыя тлумачыць, што справа ў актыўным ладзе жыцця. Акрамя танцаў, яна любіць ездзіць на веласіпедзе. А вось на дыетах не сядзіць — гэта шкодзіць страўніку. Стараецца правільна харчавацца, але, калі хочацца фаст-фуду, не адмаўляе сабе ў гэтым жаданні. А яшчэ любіць салодкае. Праўда, спажывае яго ў невялікай колькасці і выбірае «здаровыя» прысмакі — мармелад, зефір. Смяецца, што салодкае яе натхняе.

Супадзенне ці не, але любімая пара года Марыі — вясна. «Уздымаецца настрой, бо за зіму паспяваеш засумаваць па добрым надвор'і. Плюс гэта самы спрыяльны час для танцаў, бо ў паміжсаннях не спякотна».

Паклоннікі ў прыгажуні ёсць, а вось хлопца пакуль няма. Пытаемся, якія якасці для яе важныя ў будучым выбранніку. «Сумленнасць і дабрыня. Уменне танцаваць? Не абавязкова, — усміхаецца. — Але для мяне істотна, каб малады чалавек паважаў маё хобі».

Цяпер прыгажуня рыхтуецца да міжнароднага этапу конкурсу «Каралева Вясна». Ён пройдзе летам у Мінску. Марыя не выключае, што ў 2020 годзе паспрабуе пазмагацца за карону «Міс Беларусь». А дзяўчатам раіць заставацца сабой і ісці наперад да сваёй мэты.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*Пазнаёміцца з прафесіяй*

# БЕЗ ПРАВА НА ПАМЫЛКУ

## Малады ўрач хуткай дапамогі пра цану жыцця і прафесійную загартоўку



**«Брыгада № 901, на выезд!» — чуем, ступаючы на парог падстанцыі № 9 хуткай медыцынскай дапамогі сталіцы. «Вы з намі або пачакаеце тут? — звяртаецца да нас з фотакарэспандэнтам Уладзімір РАГАЧЭЎСКІ, урач кардыярэанімацыйнай брыгады. — Калі рашыліся, тады паспяшайцеся».**

* * *

— Вуліца Мендзялеева, — кажа кіроўцу Уладзімір. — Мужчына выпаў з акна.

Спецсігналы, або, як кажуць у народзе, мігалкі, уключаюцца толькі па рашэнні старшага выязной брыгады.

— Зараз гэта неабходнасць, — тлумачыць «навічкам» урач. — Па правілах на экстранны выклік медыкі павінны прыбыць не пазней чым за 19 хвілін, на тэрміновы — не пазней чым за 30, на неадкладны — не пазней чым за гадзіну пятнаццаць хвілін. Тут улічваецца час, які неабходны на дарогу і перадачу брыгадзе інфармацыі аб выкліку. Для звычайнага чалавека гэтыя словы — сінонімы. Для нас — строгая градацыя!

Да экстранных выклікаў прылічаюцца, напрыклад, паведамленні аб падзенні з вышыні, аварыях з пацярпелымі, надзвычайных сітуацыях, стратах прытомнасці. Тэрміновы — гэта арытмія, сардэчныя прыступы, траўмы, кровацячэнні. Неадкладнымі выклікамі лічацца, у прыватнасці, скаргі на ціск, высокую тэмпературу, болі ў жываце.

Мы на месцы. На дарогу пайшло 11 хвілін.

— Што ты нарабіў? Навошта? — рыдае мужчына гадоў пяцідзесяці, схіліўшыся над сынам. — Як мне жыць далей?

— Ён упаў з сёмага паверха. Вось там, — паказвае на шэры дзевяціпавярховік сведка трагедыі, — іх балкон. — Жывы ці не?

Уладзімір адмоўна махае галавой: «На жаль, вышыня нікога не шкадуе. Быў на маёй практыцы толькі адзін падобны выпадак з добрым зыходам. Дзяўчыну выратаваў казырок інтэрната, на які яна ўпала».

* * *

— Не так, канешне, хацелася пачаць свой панядзелак. Шакавала мяне ўбачанае, — не хавае сваіх эмоцый фатограф, вяртаючыся з першага выкліку.

— Вы, дзяўчаты, увогуле істоты ўразлівыя, а тут яшчэ з непрывычкі, — кажа Уладзімір. — Я, калі толькі прыйшоў сюды працаваць, таксама прымаў усё блізка да сэрца. Але своечасова зразумеў, што ў нашай справе эмоцыі трэба адкідаць у бок. Бо калі я буду кожнаму сувперажываць, то сам доўга «не працягну» — выгару маральна. Пачну губляцца, панікаваць, збіваць з толку сваіх калег. А каму патрэбны такі гора-ўрач?

Уладзімір у медыцыне з 2011 года. Хлопец скончыў педыятрычны факультэт Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

— Я крыху папрацаваў у дзіцячым хірургічным цэнтры і зразумеў, што педыятрыя — не маё. Іншая справа — хуткая дапамога. Тут сумаваць дакладна не прыйдзецца. Падчас інтэрнатуры падпрацоўваў на хуткай санітарам, таму добра разумеў, ува што, як кажуць, увязваюся, — успамінае ўрач.

Хлопец жартуе, што медыцына выбрала яго сама:

— Мой дзед па мамінай лініі быў урачом-тэрапеўтам, мама — медыцынская сястра. Я, калі можна так сказаць, з дзяцінства ведаў усю медыцынскую кухню знутры.

— І ніколі не было ніякіх сумненняў наконт будучай прафесіі? — пытаюся.

— Мне заўсёды вельмі падабалася важдацца з тэхнікай. Думаў нават на аўтамеханіка пайсці, але, як бачыце, медыцына пераважыла. Пакуль не шкадую, — дзеліцца Уладзімір. — Увогуле, пры выбары прафесійнага шляху я б раіў у першую чаргу слухаць самога сябе.

* * *

— Кожны працоўны дзень на хуткай дапамозе — непрадказальны і не падобны да іншых. А колькі іх было ўжо — не ўспомніш! Але ёсць выклікі, якія запамінаюцца. Напрыклад, калі ўдаецца ў прамым сэнсе слова вярнуць чалавека з таго свету. Памятаю, выратавалі мужчыну, які трапіў у ДТЗ. Пацярпелы цалкам аднавіўся і нават пайшоў зноў праходзіць медыцынскую камісію на права кіраваць аўтамабілем. Гэта такі моцны водгук ад працы! — не хавае эмоцый урач. — Уразаюцца ў памяць здарэнні з дзецьмі. Быў выпадак, калі бацькі далі аднагадоваму сыну пагуляцца з бутэлькай чысцацелу. Малы выліў усё змесціва на сябе і атрымаў сур'ёзныя хімічныя апёкі. Самагубствы таксама даюцца цяжка. Страшна, калі мімалётная слабасць каштуе жыцця. Я ўвогуле лічу, што з кожнай сітуацыі ёсць выйсце. Галоўнае — добра яго пашукаць.

Хлопец прызнаецца, што прафесія, як ні агароджвайся, прымушае глядзець на звыклы свет па-новаму.

— Складваецца пэўная сістэма каштоўнасцяў. Ты пачынаеш больш цаніць сваё жыццё і жыццё тых, хто побач. А яшчэ вучышся хутка прымаць правільныя рашэнні, — кажа суразмоўнік. — Памятаю, ехалі з таварышам-стаматолагам зімой на сесію ў Віцебск і на нашых вачах спадарожную машыну развярнула і выкінула ў кювет у снег. Аўтамабіль перавярнула на дах. Мы спыніліся і кінуліся да месца ДТЗ. Першай маёй думкай было адкрыць дзверы аўто і паглядзець, што з пасажырамі. Пра сваю бяспеку нават не ўспомніў. Усё скончылася добра, людзі выжылі. Разумееце, у нашай працы часу на роздум проста няма. Кожная секунда на вагу жыцця. У прамым сэнсе гэтага слова.

— У побыце таксама прымаеце ўсе рашэнні хутка і самастойна?

— Мы з жонкай усё робім разам, але апошняе слова застаецца за мной. Напэўна, таму што я старэйшы і больш вопытны, — усміхаецца хлопец. — Увогуле, на працы я станаўлюся «псіхолагам». На «хуткай» без гэтага нікуды. Урачу часта прыходзіцца разрульваць розныя канфліктныя моманты, падтрымліваць у цяжкай сітуацыі сваякоў пацыента. Гэтыя веды дапамагаюць разрульваць і свае невялікія сямейныя спрэчкі.

— Жонка звязаная з медыцынай?

— Дзякуй богу, не! Хопіць нам у сям'і аднаго ўрача! — жартуе Уладзімір. — Марына знайшла сябе ў сферы турыстычных паслуг.

Малады ўрач прызнаецца, што шмат працуе і часу на сям'ю застаецца мала:

— Пакуль ёсць сілы — трэба старацца. Калі хочаш штосьці мець — трэба нечым ахвяраваць. Канешне, усё трэба рабіць з розумам. Мяне часта пытаюць, ці не было жадання пайсці ў прыватны медыцынскі цэнтр? Маўляў, грошы там іншыя. Магу сказаць, што ўсюды ёсць свае плюсы і мінусы. Галоўнае, каб праца была ўвогуле. А ўрач хуткай дапамогі без яе дакладна не застанецца.

* * *

— Тата, ты чаму не патэлефанаваў мне? — пытаецца жанчына гадоў 45 у хворага, які ляжыць на ложку ў душным пакоі. — Чаму не націснуў чырвоную кнопку «sos»?

— А як трэба? — не разумее пенсіянер. — Я забыўся. Давай патрэніруемся.

82-гадовы мужчына страціў прытомнасць на вуліцы. Як кажуць сваякі, ён рэдка выходзіць з дому адзін, а тут нешта «стукнула ў галаву». Пенсіянера прывёў дадому міліцыянер, хуткую дапамогу выклікала суседка пацыента.

Брыгада праводзіць неабходны агляд хворага.

— У вас знясіленне. У паліклініку паедзеце? — пытаецца Уладзімір у мужчыны.

— Не! Давайце падпішу гэтыя вашыя паперкі на адмову. Мне ўжо лягчэй. Гады бяруць сваё, што тут скажаш... Сынок, а табе саму колькі? — звяртаецца да Уладзіміра пацыент. — Зусім яшчэ дзіця.

* * *

— Калі пагаліцца, мне больш за 20 гадоў ніхто ніколі не дае, — ідучы да машыны, кажа Уладзімір. — Таму я да гэтага прывык. Часта пацыенты і іх родныя кажуць: «Вы яшчэ вучыцеся?» Ведаеце, людзі любяць, калі да іх маладыя ўрачы прыязджаюць. Маўляў, у нас яшчэ ёсць працоўны запал. «Вы толькі зайшлі, а ўжо лягчэй стала!» — гавораць некаторыя.

Калі сур'ёзна, то самым галоўным кампанентам паспяховай справы Уладзімір лічыць каманду.

— У чым розніца паміж працай у стацыянары — паліклініцы, бальніцы — і на хуткай дапамозе? Тут ты сам-насам з сітуацыяй, табе няма ў каго прасіць дапамогі, парады. Выдатна, калі з табой працуюць добрыя фельчары. Мне з камандай пашанцавала, — ганарыцца сваімі калегамі Уладзімір. — На нас ляжыць вялікая адказнасць, і мы проста не маем права на памылку.

Хлопец лічыць, што галоўная ўзнагарода для кожнага ўрача — здаровыя людзі.



У салоне спецаўтамабіля.



Змесціва чамадана брыгады хуткай медыцынскай дапамогі.

— Наркотыкі — гэта самае вялікае чалавечае глупства. Не разумею грамадзян, якія свядома зводзяць сябе ў магілу. Але магу сказаць, што такіх выклікаў апошнім часам становіцца меней. Людзі часцей атручваюцца звычайнымі таблеткамі ў гіпердозах. Спайсы таксама знікаюць. А вось тых, хто злоўжывае алкаголем, заўжды хапае. З'явілася мода на глог, сардэчнік, — расказвае Уладзімір.

У сярэднім па Мінску за суткі здараецца каля 3,5 тысячы выклікаў хуткай медыцынскай дапамогі. На кожную падстанцыю, якіх у сталіцы дзесяць, прыпадае дзесяці 350. Што датычыцца непасрэдна кардыярэанімацыйнай брыгады нашага героя, то ў сярэднім гэта 8—10 выклікаў. У асеннезімовы перыяд працы становіцца больш.

* * *

— «Спорту» мне хапае на працы. За дзень так вымотваюся, што не да трэнажораў. Калі разоў так дзесяць пабегаеш на пяты паверх з усім медыцынскім абсталяваннем (адзін «чамадан» важыць 12—15 кілаграмаў), дык адразу некалькі кілаграмаў скінуць можна! — дзеліцца ўрач.

Уладзімір упэўнены, што для таго, каб стаць добрым урачом, трэба шмат працаваць над сабой.

— Я стараюся не адставаць ад часу. Медыцына, узяць хоць бы тэхніку, ідзе наперад. Некалькі гадоў таму мы сталі ездзіць на новым аўтамабілі хуткай дапамогі. Такіх у сталіцы ўсяго два. Дык вось, каб на поўную моц выкарыстоўваць усе яго магчымасці (машына прыйшла з медыцынскай апаратурай), трэба быць, як сёння кажуць, у тэме, — расказвае субяседнік. — У нас на падстанцыі перыядычна праводзяцца навуковыя канферэнцыі, семінары, ходзім на курсы павышэння кваліфікацыі.

У красавіку Уладзімір Рагачэўскі стаў найлепшым урачом хуткай медыцынскай дапамогі ў сталіцы. Хлопец перамог у конкурсе прафесійнага майстэрства «Мінскі майстар».

— Калі шчыра, я не вельмі гарэў жаданнем ісці на гэты конкурс. Да любога публічнага выступлення неабходна рыхтавацца, а ў мяне вольнага часу — проста ў абрэз. Але з такой групай падтрымкі, як у мяне, грэх было не паўдзельнічаць! Каманда сказала: «Мы за цябе ўсё зробім: праспяваем, станцуем, намалюем плакаты. Твая справа маленькая — перамагчы!» Задачу выканаў, — кажа Уладзімір. — Сам конкурс праходзіў у некалькі этапаў. Мы здавалі тэсціраванне, дэманстравалі навыкі сардэчна-лёгачнай рэанімацыі пацыентаў і валодання спецыяльнай апаратурай, прадстаўлялі на суд журы тэатралізаваныя «візітныя карткі».

— Перамога стала нечаканасцю?

— Я ва ўсім прытрымліваюся думкі: калі нешта рабіць, то трэба рабіць добра. Інакш навошта ўвогуле брацца? — кажа Уладзімір. — Быў упэўнены, што ўвайду ў тройку. А мая каманда верыла, што пераможам! Дзякуй калегам за падтрымку!

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**




**Наша адмысловае творчае спаборніцтва — конкурс «Я — малады. І мне не ўсё роўна!» — выйшла на фінішную прамую. Вычытаны апошнія дасланыя «пробы пяра», найлепшыя з іх падрыхтаваны да публікацыі. Яны з'явяцца на старонках «Чырвонкі. Чырвонай змены» найбліжэйшым часам. Потым сваё слова скажа рэдакцыйнае журы, ацаніўшы намаганні ўдзельнікаў і падвёўшы такім чынам рысу пад чарговым сезонам конкурсу. Нашым юным і маладым няштатным аўтарам застаецца толькі чакаць. Каб гэта было не так сумна, мы традыцыйна прапануем ім дасылаць свае новыя «пробы пяра» — ужо па-за творчым спаборніцтвам, як звычайныя журналісцкія матэрыялы. Найлепшыя з іх абавязкова будуць надрукаваны. Ну што, вастрыце пёры, аўтары?!**

# ДА ПАЎНАВАРТАСНАГА ЖЫЦЦЯ — ПРАЗ КАЗКУ

**Калі палёт фантазіі, творчыя здольнасці і жаданне зрабіць свет крыху ярчэйшым неабмежаваныя, з'яўляецца сапраўдная казка. А ствараюць яе маладыя людзі, што наведваюць аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў пры філіяле новалукомльскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Чашніцкага раёна. З праектам, які так і называецца — «Там, дзе нараджаецца казка», — яны сёлета прынялі ўдзел у фінале рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі» ў намінацыі «Інклюзіўная прастора». І, трэба сказаць, выклікалі пэўны рэзананс.**

Ідэя так званай лялечнай сацыялізацыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі з'явілася ў аддзяленні тэрытарыяльнага цэнтра гады з чатыры таму. Якраз тады, калі ў Новалукомлі адкрыўся філіял цэнтра. Пачыналі з невялікіх сувенірўдамавікоў, пасля асвоілі тэхналогію вырабу абрадавых лялек. Прычым шылі іх па ўсіх канонах і правілах, калі выкарыстоўваць іголку нельга, а тканіну неабходна рваць рукамі. З цягам часу канстатавалі: лялькі, зробленыя інвалідамі, карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Дзіўна, але тыя, хто набывау тут дамавіка, харашуна, абярэгі альбо талісман, каб прыцягнуць у хату дабрабыт, сцвярджаюць: лялькі «працуюць».

«Розныя куткі Беларусі, Расія, Літва, Латвія, Швецыя», — пералічваюць у філіяле тэрытарыяльнага цэнтра пункты на карце, дзе «пасяліліся» іх вырабы. І дадаюць, што, набыўшы ў іх адну ляльку, людзі абавязкова прыходзяць па новыя. Яно і зразумела: практычна адзінкавыя аўтарскія вырабы так і просяцца ў калекцыю. А з прыходам у філіял інструктара па працоўнай тэрапіі, кіраўніка гуртка Ірыны Рабчыкавай вытворчасць інтэр'ерных лялек тут выйшла на новы ўзровень.

Дарэчы, да конкурсу «100 ідэй для Беларусі» падрыхтавалі сапраўдную казачную зону, дзе знайшлі месца для Бабы Ягі і Лесуна, гномаў, персанажаў казкі «Залатая рыбка», герояў мультфільмаў. Глядзячы на іх, цяжка ўявіць, што ўсё гэта зроблена людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі.

«Так, гэта вялікая праца, — сцвярджае кіраўнік гуртка, — карпатлівая, якая патрабуе пэўных намаганняў і творчага падыходу. І я з задавальненнем хачу сказаць, што нашы хлопцы і дзяўчаты з ёй спраўляюцца».

І гэта не дзіўна для таго, хто хоць разназіраў за тым, як працуе з маладымі інвалідамі Ірына. У філіяле тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва жартуюць: «У яе нават самыя няздольныя пачынаюць тварыць». А калі без жартаў, то кіраўнік гуртка мае свой асаблівы падыход да кожнага. Дзякуючы такому спалучэнню таленавітага майстра і не менш таленавітых маладых людзей і з'яўляюцца на свет сапраўдныя шэдэўры.


Вось такіх лялек вырабляюць у Новалукомлі маладыя людзі з абмежаванымі магчымасцямі.

Між іншым, вытворчасць інтэр'ерных лялек для супрацоўнікаў філіяла — мэта не першачарговая. Галоўнае — гэта сацыялізацыя людзей з абмежаванымі магчымасцямі праз стварэнне ўмоў для развіцця творчых здольнасцяў і працоўнай занятасці. Ішлі да гэтага паступова: стварылі банк даных таленавітых інвалідаў, распрацавалі тэхналагічныя карты, вынайшлі і апрабавалі эксперыментальныя методыкі, прыцягнулі да справы навучэння людзей з абмежаванымі магчымасцямі валанцёраў з ліку пенсіянераў. І атрымалі добры вынік.

Застаецца толькі дадаць: тое, што маладыя людзі, якія наведваюць аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў, ствараюць гэты незвычайны прадукт, — сапраўдны цуд. Які абавязкова павінен прысутнічаць у кожнай казцы.

**Дар'я РАЖКО,**
**вучаніца 10 класа**
**Чашніцкай гімназіі.**

### ❍ ПРА АЎТАРА

**— «Чырвонку. Чырвоную змену» я пачала чытаць адносна нядаўна, але раблю гэта з вялікай цікавасцю. І канешне, як чалавек, які вырашыў звязаць сваё жыццё з журналістыкай, не магла не прыняць удзел у конкурсе, — расказала пра сябе 16-гадовая аўтарка. — Так, праз год я планую паступаць на факультэт журналістыкі БДУ, а пакуль «спрабую пяро» ў раённых, абласных сродках масавай інфармацыі. Акрамя гэтага, з'яўляюся рэдактарам школьнай газеты «Юны гімназіст», наведваю адпаведны гурток. Чаму выбрала менавіта такую тэму? Гэтыя маладыя людзі могуць стаць для іншых сапраўдным прыкладам мужнасці і стойкасці. Буду рада, калі пра іх даведаецца як мага больш чытачоў.**

# ЗАХОПЛЕНЫЯ НЕ НА ЖАРТ

**У Беларусі пражывае больш за два мільёны чалавек ва ўзросце ад 14 да 31 года. З іх каля 900 тысяч з'яўляюцца школьнікамі. І ў кожнага дзіцяці — свае інтарэсы і мэты. Адзін марыць стаць настаўнікам, другі — біятланістам, а трэці — інжынерам.**

**Я лічу, што магчымасць увасабляць у жыццё свае ўласныя задумы — найвялікшае багацце, падараванае людзям. Не так важна, чым ты займаешся, галоўнае — твая любоў да гэтай справы. Раскажу гісторыі трох герояў з абсалютна рознымі інтарэсамі, якія правільна скарысталіся ўсімі даступнымі магчымасцямі і, дзякуючы сваім захапленням, заявілі пра сябе на ўсю краіну.**

## ЯК СТАЦЬ ЧЭМПІЁНАМ



**Мадэлізм — тэхнічны від спорту па вырабе паменшаных копій розных тэхнікі. Шаснаццацігадовы Сцяпан Гіль з Маладзечна займаецца ім ужо больш за пяць гадоў. З самага дзяцінства хлопчык любіў збіраць немудрагелістыя цацачныя танкі і машынкі, а калі даведаўся пра існаванне ў цэнтры творчасці суднамадэльнага гуртка, быў неймаверна шчаслівы. Самай першай работай юнага канструктара стала невялікая копія савецкага ваеннага самалёта.**

— Усяго ў мяне каля дваццаці мадэляў. У сярэднім выраб простай займае некалькі тыдняў, а на самую складаную пайшло шэсць месяцаў, — расказвае Сцёпа.

За гэтыя гады юнак заваяваў шмат узнагарод. Восенню ён заняў прызавое месца на міжнародным конкурсе-выстаўцы стэндавага мадэлізму «Мінск-2017», у якім прымалі ўдзел спартсмены з Беларусі, Расіі, Літвы, Украіны і Германіі. Гэты фэст праводзіцца ў нашай краіне штогод і з кожным разам збірае ўсё больш замежных гасцей. А яшчэ Сцяпан быў узнагароджаны дыпломам другой ступені ў Кубку Рэспублікі Беларусь па суднамадэльным спорце «Залатая восень — 2017».

Але самым значным дасягненнем для спартсмена з'яўляецца перамога на першынстве Беларусі па суднамадэльным спорце «Навігацыя», на якім Сцёпа абышоў сур'ёзных сапернікаў з усёй краіны і стаў бясспрэчным лідарам у сваёй катэгорыі.

Зараз юнак пад кіраўніцтвам трэнера Мікалая Хрэшчыка актыўна рыхтуецца да чэмпіянату Рэспублікі Беларусь, які пройдзе летам, а затым планує прыняць удзел у чэмпіянаце Еўропы. Акрамя заняцця тэхнічнымі відамі спорту ў вольны час, Сцяпан вучыцца іграць на гітары, старанна вывучае французскую мову і рыхтуецца да паступлення ў Беларускую дзяржаўную акадэмію авіяцыі.

## ТВОРЧАСЦЬ БЕЗ МЕЖАЎ



**Жыццё Яны Даўбенкі, навучэнкі маладзечанскай гімназіі № 10, цесна звязанае з творчасцю. Дзяўчынка іграе на двух музычных інструментах, да нядаўняга часу з'яўлялася салісткай хору, з якім аб'ездзіла амаль усю Еўропу.**

Зараз Яна выступае сольна. Апроч таго, яна была вядучай раённых мерапрыемстваў «Дажынкі» і «Дзень Незалежнасці». Дарэчы, на кожным з такіх канцэртаў збіраецца не менш за тысячу гледачоў.

Дзякуючы сваім талентам дзяўчына і яшчэ чацвёра падлеткаў выйгралі пуцёўкі ў міжнародны лагер у Германіі і сталі ўдзельнікамі праграмы па абмене вопытам і вывучэнню замежных моў. Там былі дзеці не толькі з краін Еўропы, але і з Канады, Кітая і Эквадора. Размаўлялі хлопцы і дзяўчаты толькі на нямецкай мове, разам хадзілі ў школу, ездзілі на экскурсіі і кожны дзень даведваліся нешта новае пра родныя мясціны тых, хто адпачываў у лагеры.

— Мне здаецца, што для маіх аднагодкаў падобныя праграмы — найлепшая матывацыя для добрай вучобы і самаўдасканалення, — лічыць Яна.

## ФОРМУЛА ПОСПЕХУ

**— Хімія — царыца ўсіх навук, бо ўсё, што ёсць у нашым свеце, можна апісаць праз яе формулы. З ёй мы сутыкаемся штохвілінна. І калі я сам даведваюся нешта новае ў гэтай сферы, гэта не можа не зачароўваць, — дзеліцца сваімі думкамі Уладзіслаў Бажко, пераможца алімпіяды па хіміі, якая прайшла на міжнароднай беларуска-сірыйскай змене для адораных дзяцей у нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня».**

Зараз юнак вучыцца ў дзясятым класе маладзечанскай гімназіі № 7 і ім ганарыцца настаўніца хіміі Наталля Пашчук, якая некалькі гадоў таму звярнула ўвагу на талент і патэнцыял хлопчыка. З восьмага класа Уладзіслаў з поспехам удзельнічае ў разнастайных інтэлектуальных форумах. У сакавіку ён заваяваў дыплом трэцяй ступені ў заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па хіміі, у якім бралі ўдзел каля 40 самых адораных юных хімікаў нашай краіны.



У вольны час хлопец любіць фатаграфаваць і робіць гэта вельмі прафесійна. Перавагу Улад аддае не пастановачным, а выпадковым здымкам, якія атрымліваюцца больш «жывымі» і цікавымі.

У родным горадзе імя гэтага маладога чалавека вядома многім. Справа ў тым, што Улад з'яўляецца актыўным грамадскім дзеячам, членам клуба ЮНЕСКА «Планета».

— Наша праца накіравана на данясенне карыснай і патрэбнай інфармацыі аднагодкам у сферы нефармальнай адукацыі. Мы праводзім трэнінгі, форумы, семінары на такія тэмы, як талерантнасць, дыскрымінацыя, правы дзіцяці, прапаганда здаровага ладу жыцця. За тры гады асабіста я правёў больш за трыццаць такіх мерапрыемстваў, — расказвае юнак.

Разам з таварышамі Улад з'яўляецца валанцёрам: займаецца з дзецьмі з абмежаванымі магчымасцямі, праводзіць для іх «аздараўляльную магію» — практыкаванні-фокусы, скіраваныя на развіццё дробнай маторыкі.

...Вось такія яны, мае героі, — мэтанакіраваныя, працавітыя і таленавітыя!

**Карына МІКЛУШЫС,**
**вучаніца 10 класа СШ № 2**
**г. Маладзечна.**

### ❍ ПРА АЎТАРА

— Дзверы ў шчаслівую будучыню ў кожнага свае. Адны выдатна спяваюць, другія перамагаюць на алімпіядах, трэція — робяць макеты самалётаў, — разважае 16-гадовая аўтарка, відавочна, праводзячы паралель са сваімі героямі. — Мне ж, як журналісту-пачаткоўцу, падабаецца пісаць пра іншых людзей і іх інтарэсы. Дзякуючы такім гісторыям я не толькі натхняюся сама, але і спрабую матываваць іншых.

У Карыны гэта ўжо другая па ліку «проба пяра», дасланая (і апублікаваная) на наш творчы конкурс.

Standard.by

## ООО «Центр эксперт-услуг плюс» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже имущества, принадлежащего ООО «Веста», УНП 400053655 (Гомельская обл., г. Гомель, ул. Бабушкина, д.1)**

| Лот № | Наименование объекта аукциона | Начальная цена лота с НДС, руб. | Задаток, руб. | Шаг аукциона 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Материалы: профили мебельные, кромкооблицовочный материал, остатки ДСП, МДФ и прочих плитных материалов, стеклоизделия в ассортименте, мебельная фурнитура | 139 109,04 | 7 000 | 6 955,45 |

Задаток перечисляется на расчетный счет BY33PJCB30124047901000000933 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, БИК PJCBBY2X, УНП 491331464, получатель платежа – ООО «Центр эксперт-услуг плюс», назначение платежа: задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 24.05.2018 г.

Аукцион состоится 25 июня 2018 г. в 14.00 по адресу: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 22 июня 2018 г. до 14.00 по указанному адресу.

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, порядок проведения аукциона и оформления его результатов, дополнительная информация о предмете аукциона размещены на сайте **auction.standard.by**.

Участник, ставший победителем аукциона или единственным участником аукциона, который согласится приобрести предмет аукциона по начальной цене продажи, увеличенной на 5 %, обязан:

в течение 3 (трех) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона возместить лицу (Заказчику или Исполнителю в соответствии с договором), понесшему затраты на организацию и проведение аукциона (расходы на публикацию обязательных извещений, подготовку и публикацию рекламных материалов). Размер такого возмещения не должен превышать суммы фактических затрат на организацию и проведение аукциона, а также включать затраты по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся аукционам в случае повторного выставления объекта на торги и определяется на основании представленных документов; в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона заключить с Заказчиком договор купли-продажи предмета аукциона (далее договор купли-продажи).

Результаты аукциона подлежат аннулированию организатором аукциона в случае, если победитель аукциона уклоняется или отказывается в установленные сроки от подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам аукциона, возмещения затрат, связанных с организацией и проведением аукциона.

Организатором аукциона является ООО «Центр эксперт-услуг плюс» (адрес: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а).

По вопросам участия в аукционе обращаться по телефонам: 8 029 6488306, тел./факс 8-0232 21-21-61.

---

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

### Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белэнергозащита», г. Минск, пер. Бехтерева, д. 7 |

**Предмет аукциона**
Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, в следующем составе:

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Здание специализированное автомобильного транспорта (гараж)** (здание специализированное автомобильного транспорта), в т. ч. дворовые сооружения | 449,0 кв. м | 500/С-51681 |
| Адрес: г. Минск, ул. Бехтерева, д. 20А | | |
| **Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (материальный склад)** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 22,1 кв. м | 500/С-51680 |
| Адрес: г. Минск, ул. Бехтерева, д. 20а | | |
| **Тепловая сеть** (сооружение специализированное коммунального хозяйства) | | 500/С-1024935 |
| Адрес: г. Минск, ул. Бехтерева, 20А (здание ул. Бехтерева, 20А/1) – здание (М)) | | |

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,2851** га, предоставлен продавцу для эксплуатации и обслуживания здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, здания специализированного автомобильного транспорта и дворовых сооружений по ул. Бехтерева, 20А на праве постоянного пользования.
Ограничения (обременения прав): Охранная зона тепловых сетей, площадь 0,0554 га, охранная зона подземных кабельных линий электропередачи, площадь 0,0487 га, охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0034 га

**Начальная цена с НДС 20 % – 150 812, 36 бел. руб.**

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

В течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 27.06.2018 в 11.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25.06.2018 до 17.00 по** указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

---

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

### Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |

**Предмет аукциона**

Лот № 1. **Гараж** (здание специализированное автомобильного транспорта), общ. пл. **20,3 кв. м**, инв. № **700/С-90093**, по адресу: **Могилевская обл., г. Могилев, р-н пр-та Шмидта – ул. Габровской, блок 13, гараж 5**. Начальная цена с НДС 20 % – **2 592,08 бел. руб.**

Лот № 2. **Гараж** (здание специализированное автомобильного транспорта), общ. пл. **20,1 кв. м**, инв. № **700/С-90094**, по адресу: **Могилевская обл., г. Могилев, р-н пр-та Шмидта – ул. Габровской, блок 13, гараж 6**. Начальная цена с НДС 20 % – **2 592,08 бел. руб.**

Лот № 3. **Гараж** (здание специализированное автомобильного транспорта), общ. пл. **19,7 кв. м**, инв. № **700/С-90095**, по адресу: **Могилевская обл., г. Могилев, р-н пр-та Шмидта – ул. Габровской, блок 13, гараж 18**. Начальная цена с НДС 20 % – **3 063,37 бел. руб.**

Лот № 4. **Квартира № 81,** общ. пл. **63,2 кв. м**, инв. № **500/D-592148**, по адресу: **г. Минск, пр-д Слободской, 18-81.** Начальная цена без НДС – **119 589,33 бел. руб.**

Лот № 5. **Квартира,** общ. пл. **74,3 кв. м**, инв. № **500/D-70591**, по адресу: **г. Минск, ул. Карла Маркса, 33-2.** Начальная цена без НДС – **244 000,00 бел. руб.**

Лот № 6. **Квартира 12,** общ. пл. **67,8 кв. м,** инв. № **500/D-70611**, по адресу: **г. Минск, ул. Карла Маркса, 33-12.** Начальная цена без НДС – **224 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество,** установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия по Лотам № 5, № 6. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

**Срок заключения договора купли-продажи: 20** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **10** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.
Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, удостоверением договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и основанных на нем прав на недвижимое имущество, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **26.06.2018** в 14.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **22.06.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

---

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

### Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Оршаагропроммаш», Витебская обл., г. Орша, ул. Ленина, 215 |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1.** Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79

| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Производственный корпус цеха** (здание специализированное для металлургического производства и металлообработки) | 16 006,4 кв. м | 110/С-110941 |
| **Открытый склад металла** (сооружение специализированное складов, хранилищ) | 1 723 кв. м | 110/С-112475 |
| Составные части и принадлежности: (А)-площадка | | |
| **Площадка завода металлоконструкций** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) | 3 014 кв. м | 110/С-113604 |

***Сведения о земельном участке***: пл. **2,4736** га, предоставлен продавцу для обслуживания производственного корпуса цеха, открытого склада металла, площадки завода металлоконструкций на праве постоянного пользования

**Начальная цена с НДС 20 % – 2 036 772,17 бел. руб. (снижена на 50 %)**

**Лот № 2.** Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79

| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Административно-производственный корпус** (здание административно-хозяйственное) | 1 659 кв. м | 110/С-85249 |
| **Автодорога завода** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) | 2 358 кв. м | 110/С-113603 |
| **Резервуар для воды** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения) | 1 284 кв. м | 110/С-111498 |
| Составные части и принадлежности: резервуар для воды (А) с техническими характеристиками согласно техническому паспорту | | |
| **Корпус нейтрализации** (здание специализированное иного назначения) | 352,7 кв. м | 110/С-111501 |
| *Составные части и принадлежности: кирпичный склад* | | |

***Сведения о земельном участке***: пл. **1,0677** га, предоставлен продавцу для обслуживания и эксплуатации существующих зданий и сооружений комбината на праве постоянного пользования

**Начальная цена с НДС 20 % – 493 121,08 бел. руб. (снижена на 50 %)**

**Лот № 3.** Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79

| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Цех блоков** (здание неустановленного назначения) | 3 748 кв. м | 110/С-85251 |
| Составные части и принадлежности: подвал | | |
| **Автодорога бетонных блоков** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) | 9 048 кв. м | 110/С-112843 |
| Составные части и принадлежности: автодорога бетонных блоков (А), два покрытия (а1, а2) | | |
| **Здание гаража** (здание специализированное автомобильного транспорта) | 30,5 кв. м | 110/С-111500 |
| **Здание гаражей** (здание специализированное автомобильного транспорта) | 459,7 кв. м | 110/С-111499 |
| **Открытый склад готовой продукции** (сооружение специализированное складов, хранилищ) | 4 226 кв. м | 110/С-112473 |
| Составные части и принадлежности: (А)-площадка | | |
| **Склад извести** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 119,6 кв. м | 110/С-111540 |
| Составные части и принадлежности: бетонный подвал, навес из металлических столбов, емкости | | |
| **Склад цемента** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 63,0 кв. м | 110/С-85258 |
| Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание склада цемента с подвалом и навесом. | | |
| **Склад сыпучих материалов** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 1885,3 кв. м | 110/С-85261 |
| *Составные части и принадлежности: две кирпичные пристройки, три бетонных, одна шиферная, одна из металлического каркаса, обшитая шифером, два навеса* | | |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельных участках** | пл. **2,2139** га, предоставлен продавцу для обслуживания цеха блоков, автодороги бетонных блоков, здания гаража, здания гаражей, открытого склада готовой продукции, склада извести, склада цемента, склада сыпучих материалов на праве постоянного пользования |
| | пл. **0,4901** га, предоставлен продавцу для обслуживания склада сыпучих материалов на праве постоянного пользования |

**Начальная цена с НДС 20 % – 1 042 307,78 бел. руб. (снижена на 50 %)**

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 1 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона по лотам № 1-2 опубликовано в газете «Звязда» 02.05.2018 г., по лоту № 3 в газете «Звязда» 08.05.2018 г.

**Аукцион состоится 06.06.2018 в 11.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.06.2018 до 17.00 по** указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

---

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

### Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
Эксперт упэўнена, што праблемы сведчаць пра цяжкасць дыялогу паміж мясцовай уладай, грамадствам і экспертамі. Культурная спадчына, асабліва буйная, — гэта не асобныя аб'екты, а агульная тэрыторыя, на якой ёсць жыхары, прадстаўнікі бізнесу, розныя ўласнікі, якім даводзіцца дамаўляцца паміж сабой. Ала Сташкевіч прывяла прыклад Мсціслава, каб паказаць маруднасць працэсу супрацоўніцтва. Спецыялістам спатрэбілася два гады толькі на тое, каб вызначыць умовы ўзаемадзеяння. Праводзілі трэнінгі, апытанні, іншыя мерапрыемствы з агульнай тэмай «Якім я бачу свой горад праз колькі гадоў». На першых жа водгуках стаў відавочны канфлікт інтарэсаў.

— Калі пытаешся аб праблемах любога горада з гістарычнай часткай, ніхто з жыхароў не скажа: «Нашаму старажытнаму касцёлу патрэбна рэстаўрацыя», — разважае Ала Сташкевіч. — Не, мы пачуем скаргі на адсутнасць дзіцячых садкоў, пытанні пра рамонт дарог, іншыя сацыяльна-эканамічныя праблемы. Бізнесу не падабаецца шматлікія абмежаванні на вядзенне спраў у гістарычным квартале. Моладзь лічыць, што там сумна, няма забаўляльных, спартыўных устаноў, часта абмежаваны рух грамадскага транспарту і веласіпедыстаў. Эксперты ж бачаць іншую «ідэальную карціну». Для многіх з іх яшчэ актуальная «савецкая» схема стаўлення да культуры. Гістарычныя помнікі трэба адмяжоўваць ад астатняга гарадскога ландшафту. Атрымліваецца нібы рэзервацыя для турыстаў, куды наведвальнікаў пускаюць неахвотна. Па вечарах гэта «мёртвы квартал», бо жыхары і госці адпачываюць у іншых частках горада. Відавочна, такі падыход састарэў. З пункту гледжання ўлад, для рэарганізацыі працы патрэбны сродкі, якіх у раённага горада не надта многа. Аднак чамусьці мала хто бачыць у гісторыка-культурнай спадчыне яшчэ і эканамічны, а не толькі духоўна-каштоўнасны патэнцыял. Культурны рэсурс у перспектыве здольны вырашыць большасць мясцовых праблем: забяспечыць рабочымі месцамі, пляцоўкамі рэалізацыі для бізнесу і крэатыўных ідэй, павысіць агульны ўзровень жыцця. Іншая справа, што грамадства надзвычай марудна ўсведамляе магчымасці, як гэта мы бачым на прыкладзе Мсціслава. А пасля таго як «адкрыюцца вочы», патрэбны яшчэ нейкі час, каб усе структуры навучыліся весці паміж сабой дыялог і працаваць разам на агульную справу.

Яшчэ адна тыповая «хвароба» на месцах — нерацыянальнае выкарыстанне сродкаў. Напрыклад, у невялікім райцэнтры будуюць новенькі шыкоўны загс. Справа добрая і патрэбная, але, калі падлічыць колькасць рэгістрацый шлюбу ў год, стане зразумела, што большасць часу будынак стаіць пустым, пры гэтым расходуюцца грошы на заробак штату, аплату камунальных паслуг і г. д. Наспявае пытанне: чаму б не выкарыстаць сродкі рацыянальна? Укласці грошы ў гісторыка-культурную каштоўнасць, да якой прыедуць турысты і акупяць выдаткі, а рэгістрацыі можна праводзіць і на базе Дома культуры ці таго ж самага адрэстаўраванага палаца.

«Ну, добра, — можа сказаць чытач. — Эксперты паспрачаліся і абмеркавалі праблемы, але ці датычацца яны мяне? Што я магу зрабіць для захавання спадчыны?» Ала Сташкевіч раіць:

— Інфармуйце! Расказвайце пра выдатныя помнікі сябрам, пішыце пра іх у блогах, рабіце фота, пашырайце аўдыторыю неабыякавых.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**

■ Нашы традыцыі

## Зялёныя святкі



**Так праваслаўныя вернікі часам называюць Сёмуху — апошняе вясеннае свята, якое супадае з Днём Святой Тройцы. У гэты дзень гаспадары ўпрыгожваюць свае хаты галінкамі бярозы, дубу, клёну і праводзяць цікавыя рытуалы з раслінамі.**

Ваджэнне куста — адзін з такіх традыцыйных абрадаў, які днямі ўпершыню правялі ў вёсцы Гродзі, што на Ашмяншчыне. Жанчыну («кусту»), якая лічылася сімвалам ураджаю, упрыгожылі зялёнымі галінкамі і вадзілі па вёсцы, спяваючы песні, у якіх славілі гаспадароў і прасілі адарыць «кусту».

Дзяўчаты ж у гэты дзень «кумілі-ся» — запляталі бярозавыя галіны на ўзор вяночкаў і ўпрыгожвалі бярозы стужачкамі. Для гасцей свята ў Гродзях арганізавалі «Гульнявы кірмаш», забаўляльныя конкурсы, пачастункі і танцы. І вядома ж, усе дакрануліся да свята, прайшоўшы праз «Сёмушную арку».

**Ірына СІДАРОК.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
## по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

**Организатор электронных торгов:** Новопольский сельский исполнительный комитет, Минский обл., Пуховичский р-н, аг. Новополье, ул. Центральная, 21, тел.: 8 (017) 133 03 16, 133 03 35, 133 01 39, тел. моб. 8 (029) 546 06 71.
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by.
Дата проведения электронных торгов: **22 июня 2018 года.**
**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, *га* | Инженерная инфраструктура | Нач. цена, *(руб.)* | Задаток, *(руб.)* | Расходы по подготовке, *(руб.)* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Распутье, ул. Центральная, № 1Б | 624484007601000057 | 0,1400 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения, газ в ближайшей перспективе* | 2700,00 | 270,00 | 1358,09 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 2 | д. Буденовка, ул. Дружная, д. 1А | 624484001301000020 | 0,1500 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения* | 3525,00 | 352,50 | 1367,81 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 3 | д. Буденовка, ул. Дружная, д. 14А | 624484001301000022 | 0,1500 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения* | 3600,00 | 360,00 | 1215,33 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 4 | д. Шелеги, ул. Радужная, д. 4А | 624484008401000082 | 0,1277 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения* | 2491,00 | 249,10 | 1369,65 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 5 | д. Шелеги, ул. Радужная, д. 4 | 624484008401000081 | 0,1271 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения* | 2480,00 | 248,00 | 1269,17 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 6 | аг. Сергеевичи, ул. Озерная, д. 22А | 624484007701000338 | 0,1100 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения* | 2380,00 | 238,00 | 1462,09 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 7 | аг. Сергеевичи, ул. Восточная, (У №1) | 624484007701000340 | 0,1320 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения* | 2900,00 | 290,00 | 1323,36 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 8 | д. Маховка, ул. Лесная | 624484005201000104 | 0,1500 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения, природного газа* | 4100,00 | 410,00 | 1369,69 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 9 | д. Подлядье, пер. Южный, 8 | 624484006601000112 | 0,1075 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения* | 2300,00 | 230,00 | 1449,04 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 10 | д. Дудичи, ул. Полевая, У- 2 | 624484003101000220 | 0,1500 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения, природного газа* | 5000,00 | 500,00 | 1380,30 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 11 | д. Дудичи, ул. Полевая, У-1 | 624484003101000219 | 0,1500 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения, природного газа* | 5000,00 | 500,00 | 1522,54 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 12 | д. Бахаровичи, ул. Центральная | 624484000601000167 | 0,1500 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения, природного газа* | 4500,00 | 450,00 | 1472,92 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 13 | д. Ленинский, ул. Соловьиная, у.2 | 624484004901000178 | 0,1215 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения, природного газа* | 3500,00 | 350,00 | 1558,72 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 14 | д. Ленинский, ул. Соловьиная, у.1 | 624484004901000179 | 0,1418 | Подъездные пути местного значения. Сети электроснабжения, природного газа* | 4000,00 | 400,00 | 1383,5 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 15 | д. Культура, ул. Усходняя, У-2 | 624484004601000051 | 0,1488 | Подъездные пути местного значения. Свет в ближайшей перспективе* | 3700,00 | 370,00 | 1164,26 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |

** в разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, которые имеются в данном населенном пункте. Подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.*

**Задаток** для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка –** до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **18 июня 2018 года, до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за земельный участок, продаваемый в частную собственность, или за право заключения договора аренды земельного участка.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, местный исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола, а также заключает с ним договор аренды земельного участка – в случае проведения электронных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков.

## ЗАО «Белреализация» объявляет о проведении торгов

Публичные торги в электронной форме по продаже имущества в исполнительном производстве будут проведены: **12 июня 2018 г**., **начало 09.00, окончание 18.00** на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY**.**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27. тел.: (8017) 298-53-53, e-mail: marketing@zalog.by

| Наименование лота | Начальная цена, бел. руб. | Собственник | Местонахождение |
|---|---|---|---|
| **Автомобиль Toyota Corolla, 1996 г. в., цвет синий** | 1 270,00 | Шевкунов С. А. | г. Гомель, пр-т Речицкий, 131а |
| **Погрузчик телескопический JCB 532-120, 2004 г. в.** | 57 400,00 | ОДО «КАИ-СтройСервис» | г. Гомель, Кореневское шоссе, 18 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-03.

Для участия в торгах необходимо: 1) в срок по **11 июня 2018 г. 16.00** перечислить задаток по выбранному лоту в размере 10 % от начальной стоимости лота; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY.

Величина первого шага торгов составляет 5 % от начальной стоимости лота. Победителем торгов признается участник торгов, предложивший наибольшую цену за лот. Победитель торгов (покупатель) обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов. Подробнее на WWW.BELTORGI.BY.

## Продается имущественный комплекс в составе:

**Капитальное строение с инв. № 321/С-1584**, **общей площадью 977,0 кв. м,** наименование – **одноэтажное бетонное здание запасных частей.** Местонахождение: Гомельская область, г. Буда-Кошелево, ул. Прищепы, 3Г/3.

**Капитальное строение с инв. № 321/С-1582**, **общей площадью 261,0 кв. м,** наименование – **одноэтажное металлическое здание склада.** Местонахождение: Гомельская область, г. Буда-Кошелево, ул. Прищепы, 3Г/2.

**Капитальное строение с инв. № 321/С-8396**, **общей площадью 937,3 кв. м,** наименование – **одноэтажное кирпичное административное здание с тремя кирпичными пристройками.** Местонахождение: Гомельская область, г. Буда-Кошелево, ул. Прищепы, 3Г.

**Информация о земельном участке:** кадастровый номер **320550100001000971 площадью 1,8633 га** – для обслуживания производственных и складских помещений **(право постоянного пользования).** Местонахождение: Гомельская область, г. Буда-Кошелево, ул. Прищепы, 3Г.

**Капитальное строение с инв. № 321/С-1580**, **общей площадью 23,0 кв. м,** наименование – **одноэтажное кирпичное здание проходной.** Местонахождение: Гомельская область, г. Буда-Кошелево, ул. Прищепы, 3Г/1.

**Информация о земельном участке:** кадастровый номер **320550100001000972 площадью 0,0806 га** – для обслуживания производственных и складских помещений **(право постоянного пользования).** Местонахождение: Гомельская область, г. Буда-Кошелево, ул. Прищепы, 3Д.

**Продавец:** СП «АМИПАК» – ОАО, г. Буда-Кошелево, ул. Ленина, 61 «а». Конт. тел.: 8 (044) 780-72-65, 8 (02336) 7-46-44 – Кузьменко Олег Владимирович.

Реализация производится 1 (одним) лотом. Цена продажи одним лотом с учетом НДС составляет – 66 100,00 (шестьдесят шесть тысяч сто рублей 00 копеек) белорусских рублей.

УНП 400054120

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Веста-Борисов» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже **приемного пункта стеклотары № 6 с инвентарным номером 610/С-13842,** общей площадью **59,0 кв. м**, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 640400000006000004 площадью 0,0207 га, по адресу: **Минская область, г. Борисов, пер. Больничный, 2.**

**Начальная цена с НДС (20 %) – 9 516,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (951,00 бел. руб.) перечисляется на р/с № BY55BPSB3 0121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона возмещает Организатору аукциона затраты на организацию и проведение результативного аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **25.06.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.06.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельных участков

Организатор аукциона – Любанский районный исполнительный комитет

| № лота | Сведения о виде и предмете аукциона | Адрес объекта и его назначение | Срок аренды | Начальная цена объекта (рублей) | Сумма задатка (рублей) | Затраты по организации и проведению аукциона (рублей) | Ограничения и (обременение) прав в использовании земель |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | Аукцион на право заключения договора аренды земельного участка | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) расположенный по адресу: Минская обл., г. Любань, улица Луговая, участок № 1, площадь – 0,1430 га, кадастровый № 623450100001003120 | 50 лет | 1 881,91 | 188,19 | 2 493,62 + расходы по размещению извещения в СМИ | Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадью – 0,0001 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадью – 0,0127 га; охранная зона объектов газораспределительной системы, площадью – 0,0005 га |
| 2 | Аукцион на право заключения договора аренды земельного участка | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) расположенный по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Тенистая, участок № 138, площадь – 0,1353 га, кадастровый № 623450100001003042 | 50 лет | 1 354,33 | 135,43 | 69,0 + расходы по размещению извещения в СМИ | Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадью – 0,0042 га |
| 3 | Аукцион на право заключения договора аренды земельного участка | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) расположенный по адресу: Минская обл., г. Любань, улица Луговая, участок № 2, площадь – 0,1210 га, кадастровый № 623450100001003121 | 50 лет | 1 592,39 | 159,24 | 2 506,01 + расходы по размещению извещения в СМИ | Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадью – 0,0006 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадью – 0,0244 га; охранная зона объектов газораспределительной системы, площадью – 0,0022 га |
| 4 | Аукцион на право заключения договора аренды земельного участка | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) расположенный по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Тенистая, участок № 139, площадь – 0,1349 га, кадастровый № 623450100001003040 | 50 лет | 1 350,32 | 135,03 | 69,0 + расходы по размещению извещения в СМИ | Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадью – 0,0042 га |

Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с райфо № BY58 AKBB 36006200013190000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, код платежа 04002, УНН 600537220 с пометкой «Задаток за земельный участок, участие в аукционе».

**Аукцион состоится 26.06.2018 г., в 11.00** г. Любань, ул. Первомайская, 24а, малый зал заседаний райисполкома, 3-й этаж.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, потерей сельскохозяйственного производства, связанные с изъятием земельного участка и публикацией извещения в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 10 рабочих дней со дня получения протокола аукциона. В течение двух рабочих дней после совершения вышеуказанных действий заключить с Любанским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды земельного участка осуществить государственную регистрацию возникновения права аренды на него;

получить в установленном порядке: разрешение Любанского районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ, архитектурно-планировочное задание, технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разработку архитектурного (строительного) проекта на строительство объекта в срок, не превышающий четыре месяца;

в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на предоставленный земельный участок приступить к занятию данного участка в соответствии с указанной целью и условиями его предоставления;

завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией.

Наличие возможности подключения к линии электроснабжения, водоснабжения, водоотведения и газоснабжения.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков на основании постановления Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462, при наличии не менее двух участников.

Для участия в аукционе представляются: заверенная банком копия платежного документа, подтверждающая внесение задатка, копия паспорта или иного документа, удостоверяющего личность, для ИП и юридических лиц – копия свидетельства о государственной регистрации, копия устава, копия доверенности. При подаче заявления заключается соглашение с райисполкомом о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 25.05.2018 года** в рабочие дни с 8.00 до 16.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Любань, ул. Первомайская, 24а, райисполком, землеустроительная служба, кабинет 3.9. **Окончание приема заявлений на участие в аукционе – 20.06.2018 года в 13.00.**

Информацию о расположении земельных участков можно получить в землеустроительной службе райисполкома, участники аукциона предварительно могут ознакомится с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков, предварительно позвонив по контактному телефону (8-01794) 67-5-86 (секретарь комиссии).

Камунальныя стасункі

# УНІТАЗ ЗАМЕСТ СМЕТНІЦЫ

## Што і чаму кідаюць жыхары ў каналізацыю

**Будаўнічыя адходы, калготкі, дзіцячыя цацкі, памперсы... Гэта прыклады і далёка не поўны пералік рэчаў, якія жыхары аднаго са сталічных кааператываў спускаюць ва ўласныя ўнітазы. Праз такі «гаспадарчы» падыход каналізацыю трох пад'ездаў за восем гадоў прачышчалі больш за 300 (!) разоў. Калі не спраўляліся сантэхнікі, далучалася аварыйная служба, а сем разоў заказвалі нават электрамеханічную чыстку (кошт паслугі — больш як 400 рублёў). Прычым усё за сродкі саміх жа ўласнікаў. Аднак гэта не перашкаджае людзям працягваць выкарыстоўваць унітазы замест сметніцы. Больш за тое, аказваецца, гэткім жа чынам дзейнічаюць многія жыхары іншых дамоў. Ледзьве не ўсё іх бытавое смецце: косткі, лупіны, пракіслыя гуркі, анучы, пластыкавыя бутэлькі — паглынае ўнітаз. А ёсць кватэры, дзе ўвогуле не ведаюць, што такое вядро для смецця.**

### Ні па-руску, ні па-кітайску

**Сяргей ЖУКАЎ, старшыня жыллёва-будаўнічага спажывецкага кааператыва (ЖБСК) «Авераж»,** пачаў барацьбу з непрыемнымі пахамі ў пад'ездах дома ад забітай каналізацыі яшчэ ў 2010 годзе. Напачатку праблемы спісваліся на камунікацыі, якія дрэнна працуюць і праз гэта забіваюцца, на смеццеправод, які намагаліся прамываць часцей. У падвале на кожнай трубе ўстанавілі рэвізіі — інжынерныя прыстасаванні, якія ў выпадку засору не дазваляюць адходам каналізацыі падымацца па трубе на першы паверх да жыльцоў. Аднак ліквідаваць праблему цалкам так і не ўдалося.

**«Унітаз рэальна выкарыстоўваюць замест сметніцы. Толькі мала хто ведае, што не толькі вялікія кавалкі адходаў забіваюць каналізацыю. Тыя ж плавальныя пузыры рыбы, што здаюцца маленькімі, у трубаправодзе надзьмуваюцца і спыняюцца ў канале».**

— Цяпер, калі забіваюцца камунікацыі, вада і бруд з іх скіруюцца ў падвал праз адводную трубку. Так будуць меншыя страты для маёмасці, чым калі б гэта ўсё падымалася ў жыллё. Раней вечна было ўсё заліта ў падвале — зараз тут можна ў туфлях хадзіць, — падзяліўся старшыня. — Тым не менш засоры з'яўляюцца рэгулярна. У нас з гарадской аварыйнай службай нават дагавор заключаны, каб можна было тэрмінова ліквідаваць забіванне. Толькі сёлета іх ужо больш як 20 разоў выклікалі. Прычым аўтары гэтых здарэнняў — самі ж нашы жыхары, якія чамусьці кідаюць ва ўнітазы ўсё, што захочуць.

Старшыня спрабаваў дагрукацца да сумлення ўласнікаў, пісаў аб'явы, дзе тлумачыў, здавалася б, зразумелыя рэчы, — што смецце нельга кідаць ва ўнітаз. Калі ў доме здымалі кватэры іншаземцы, — нават на кітайскую мову перакладаў, бо баяўся, можа, не разумеюць. Пра памперсы асобна ўдакладняў, што яны ў вадзе не раствараюцца. Усё дарма.

Крыху дапамагло, калі пачаў пісаць лічбы з колькасцю выпадкаў забітай каналізацыі па кожным з пад'ездаў. Уласнікі першага, дзе праблем было менш за ўсё, два гады ўвогуле не смецілі, каб лідарства падтрымаць. А пасля ўзяліся за старое.

Даходзіла да таго, што гідрапрамыўкі, якія робіць гарадская аварыйная служба, не дапамагалі прыбраць смеццевыя засоры. Неяк намагаліся зрабіць гэта 17 (!) разоў, пакуль атрымалася нарэшце прачысціць каналізацыю з дапамогай электрамеханічнай



чысткі, для чаго наймалі ўжо прыватную службу.

— На сходах я прапаноўваў плаціць за работу жыхарам таго пад'езда, дзе здарыўся засор. Не пагадзіліся. Працягваюць смеціць і плаціць за гэта з уласнай кішэні, — кажа ў роспачы старшыня. — Як расказаць людзям пра элементарныя правілы карыстання ўласнымі памяшканнямі, у мяне больш ідэй няма. Вось і сёння мы з вамі гаворым, а ў мяне на доме ёсць забітая каналізацыя, дакладна ведаю. Здавалася б, дробязь, але ўсё наша жыццё складаецца з дробязяў.

### Смеццеправоды заварылі, а кантэйнер далёка

Забітая каналізацыя, як аказалася, зусім не дробязь, і з'яўляецца праблема, як правіла, па дзвюх прычынах, кажуць спецыялісты: праз неахайнасць жыхароў ці няправільнае становішча трубы. Калі засор пастаянна ў адным месцы, хутчэй за ўсё, праблема ў камунікацыях. А калі забіванне ўзнікае ў розных частках трубаправода, — гэта, як правіла, віна жыхароў, значыць, яны нешта прапіхваюць ва ўнітаз. Каб знайсці праблемны ўчастак, прыходзіцца праводзіць тэлеінспекцыю — у трубу запускаецца невялічкі маніторчык, які паказвае каналізацыйныя «вантробы».

— Здараецца, што грунт прасядае і частка трубаправода апускаецца ніжэй. У месцы прагібу збіраюцца вада і бруд. Як вынік — засор. Каб гэта не паўтаралася, трэба ці трубу вяртаць на месца, каб яна ляжала прама, ці ўвогуле мяняць кавалак трубаправода. Асабліва гэта датычыцца чыгунных камунікацый. Унутры іх могуць адслойвацца і зусім маленечкія металічныя кавалачкі, за іх будзе чапляцца бруд і ўтварацца засор, — растлумачыў **Міхаіл ШУБЯНОК, кіроўца прамывачнай машыны гарадской аварыйнай службы.** — А калі з камунікацыямі ўсё ў парадку, то ўтварэнне засораў залежыць толькі ад людзей.

Супрацоўнікі аварыйкі кажуць, што з гадамі сантэхнічная сітуацыя ў сталіцы ўскладняецца. Пры гэтым у старых пяціпавярховіках, дзе часцей за ўсё жывуць пажылыя людзі, падобныя праблемы здараюцца не так часта. А ў дамах новых, асабліва там, дзе здымныя кватэры, увогуле жах, калі ўласнікі не сочаць за імі. Сёлета служба ўпершыню сутыкнулася з тым, што ў Мінску колькасць выпадкаў забітай каналізацыі павялічылася ў разы.

— У вялікім горадзе ў людзей паскораны рытм жыцця, таму яны шукаюць шляхі, як яго сабе спрасціць, і зрабіць лепшым і хутчэйшым. Адаптуюцца, як могуць. Калі, на думку жыхароў, адкіды маюць крыху вадкую кансістэнцыю або змяшчаюць у сабе хоць нейкую вільгаць, то можна ўпіхнуць іх ва ўнітаз, — упэўнены **Аляксандр ЕРАФЕЕЎ, дырэктар гарадской аварыйнай службы.** — Смеццеправоды заварылі? А чалавек прыйшоў з працы, і яму ўжо проста лянівa з 16-га паверха спускацца да кантэйнераў. У лепшым выпадку ён выставіць пакет са смеццем за дзверы.

Вось нядаўна адной бабулі спецыялісты ў кватэры прачысцілі засор каналізацыі. Паказваюць ёй, што дасталі лупіне ад бульбы, агуркі пракіслыя, кажуць, што так нельга рабіць. Жанчына паслухала, і толькі яны ў дзверы выходзіць, а старая ўжо наступны пакецік са смеццем нясе ў туалет. Ёй кажуць: «Што ж вы робіце?!» А яна: «У мяне ногі баляць, я не магу інакш».

— Што толькі не даставалі мы з трубы. Іншы раз здзіўляешся, як гэта ўвогуле маглі ва ўнітаз прапхнуць. Гэта ж трэба было сілу прымяніць, каб прайшло, — дзеліцца **Барыс САЎРЫЦКІ, кіроўца прамывачнай машыны** са стажам амаль у 40 гадоў. — Унітаз рэальна выкарыстоўваюць замест сметніцы. Толькі мала хто ведае, што не толькі вялікія кавалкі адходаў забіваюць каналізацыю. Тыя ж плавальныя пузыры рыбы, што здаюцца маленькімі, у трубаправодзе надзьмуваюцца і спыняюцца ў канале.

А быў выпадак, што і кацянят знайшлі, якіх спусцілі ва ўнітаз нейкія гаспадары-нелюдзі.

### Безгаспадарчасць — ад беспакаранасці

Аварыйная служба працуе кругласутачна ў чатыры змены. У рабочыя гадзіны з панядзелка па пятніцу — дзеліць будні з камунальнымі службамі. Па выхадных аварыйка — адзіны сродак дапамогі.

Пры гэтым шмат нараканняў, што аварыйку прыходзіцца доўга чакаць, і нават калі яна з'яўляецца, спецыялісты проста перакрываюць ваду.

— Перш-наперш мы выязджаем у кватэры з заліццём, калі існуе пагроза нанясення матэрыяльнай шкоды. На гэта нам даецца 30 хвілін. Калі ў падвале цячэ, сантэхнічная брыгада перакрывае ваду, а калі зварачны экіпаж вызваляецца з папярэдняга месца працы, ён займаецца вырашэннем наступнай праблемы, — адказвае на гэта **Анатоль ЛЯХ, начальнік змены.** — Аднак жыхар не можа вызначыць, наколькі сітуацыя крытычная, таму здараюцца і казусы. Выклікаюць на заліццё падвала, а там нехта кран адкрыў і з яго вада цячэ. Нашы сантэхнікі проста яго закрываюць. Ці пра заліццё кватэры паведамляюць, а там на стале дзве кроплі вісіць. А ў гэты час недзе сапраўдная праблема.

У новых дамах, дзе нават яшчэ не жывуць людзі, праблем таксама хапае.

— Будаўнічыя сумесі, якія нядбайныя рамонтнікі зліваюць ва ўнітаз, застываюць. І гаспадар, які пасля засяліцца, можа нават не ведаць аб праблеме. Часта прыходзіцца новыя камунікацыі мяняць праз гэта і свежы рамонт ламаць, калі немагчыма дабрацца інакш да трубы, — дадае спецыяліст.

У шматпавярховых дамах і нават жыллі ў пяць павярхоў вызначыць і пакараць вінаватага ў стварэнні засору немагчыма. Ён можа ўтварыцца паміж трэцім і другім паверхамі, але гэта не значыць, што смецце не ссунулася ўніз з сёмага.

Дарэчы, стан міжпавярховых труб, якія праходзяць па кватэры, павінны раз на паўгода правяраць камунальныя службы і, калі трэба, ачышчаць іх ад тлушчавых і іншых адкладаў, каб перадухіліць магчымыя аварыі. Частка камунікацый у жыллі пасля ўводных вентыляў — зона адказнасці жыхароў. Калі нешта здарыцца тут, замену будзе аплачваць уласнік.

Безгаспадарчасць людзей — ад беспакаранасці, упэўнены дырэктар аварыйнай службы. Калі выезд брыгады аплачвае абслуговая арганізацыя і нават самі ўласнікі, канкрэтна вінаватага ўсё роўна не адшукаць. Таму і працягваюць карыстацца маёмасцю па прынцыпе «што хачу, тое і раблю».

Як сказалі ў Мінжылкамгасе, згодна з законам аб сумесным домаўладанні, існуе тыпавы дагавор абслугоўвання, дзе прадугледжана беражлівае стаўленне да маёмасці. Аднак гаворка ідзе пра агульную шкоду. Прыцягнуць людзей да адказнасці за няправільнае карыстанне каналізацыяй немагчыма.

Застаецца толькі пацiскаць плячыма: навошта жыхары гадзяць у прамым і пераносным сэнсе і сабе, і суседзям. А можа, нехта, прачытаўшы, пазнае сябе...

Ірына СІДАРОК

Будпляцоўка

# ЗЯМЕЛЬНЫ КАВАРДАК?

**Па заканадаўстве грамадзянін, які мае патрэбу ў жыллі, павінен пабудаваць дом на працягу трох гадоў пасля атрымання ўчастка. Калі ж гэта не адбылося, участак забяруць і прададуць праз аўкцыён. Гэта агаворваецца ва Указе Прэзідэнта № 87. Але не заўсёды выконваецца.**

У КДК Магілёўскай вобласці звярнулася жанчына, якая набыла такі «пратэрмінаваны» ўчастак. Іншымі словамі, тры гады, адпушчаныя папярэдняму ўладальніку на будаўніцтва дома, ужо скончыліся. Замест таго, каб канфіскаваць гэты ўчастак у ранейшага гаспадара і правесці яго праз аўкцыён, Магілёўскі райвыканкам прыняў рашэнне дазволіць новай прэтэндэнцы распачаць праектна-пошукавыя работы, знесці закансерваваную незавершаную будоўлю і пабудаваць сабе жылы дом. І толькі пасля таго, як новая гаспадыня ўчастка ачысціла яго і пачала ўзводзіць жыллё, сельвыканкам паведаміў ёй аб канфіскацыі зямельнага ўчастка.

**«Пасля ўмяшання Дзяржкантролю 44 чалавекі ўсё ж дабудавалі свае дамы. Астатнія па-ранейшаму не спяшаюцца. Як і сельвыканкамы — з прыняццем мер па канфіскацыі ў іх участкаў».**

— Пры праверцы Буйніцкага і Пашкаўскага сельвыканкамаў разам з грубейшымі парушэннямі зямельнага заканадаўства выяўлена сістэматычнае невыкананне імі і службамі Магілёўскага райвыканкама функцый па кантролі за выкарыстаннем зямель і будаўніцтвам індывідуальных жылых дамоў, — паведаміла **начальнік аддзела кантролю дзяржмаёмасці і выкарыстання зямель Камітэта дзяржкантролю Магілёўскай вобласці Таццяна ДЗІМІДЗЮК.** — На працягу 2016—2017 гадоў выяўлена 90 грамадзян, якія не ўклаліся ў абазначаныя тэрміны будаўніцтва, чым парушылі першы пункт Указа № 87. Пры гэтым сельвыканкамы не прымянялі да парушальнікаў прадугледжаныя законам захады — «незавершанае» не ацэньвалі, зямельныя ўчасткі не канфіскоўвалі. Пасля ўмяшання Дзяржкантролю 44 чалавекі ўсё ж дабудавалі свае дамы. Астатнія па-ранейшаму не спяшаюцца. Як і сельвыканкамы — з прыняццем мер па канфіскацыі ў іх участкаў. І гэта пры тым, што ў Магілёўскім раёне кошт аднаго такога надзела дасягае васьмі тысяч долараў. Магілёўскі райвыканкам яшчэ ў снежні мінулага года праінфармаваў, што збіраецца забраць тры ўчасткі. Але да сённяшняга дня Магілёўскае агенцтва па дзяржрэгістрацыі і зямельным кадастры не зрабіла іх ацэнку.

— Большасць парушэнняў зямельнага заканадаўства абумоўлена бяздзейнасцю канкрэтных работнікаў выканкамаў і слабым кантролем за выкананнем заканадаўства з боку адпаведных служб, — канстатавала Таццяна Дзімідзюк. — Наспела неабходнасць распрацоўкі праграмнага комплексу, які дазволіць ажыццяўляць аператыўны кантроль за выкарыстаннем зямельных участкаў. Пакуль аддзелы архітэктуры і будаўніцтва райвыканкамаў не валодаюць інфармацыяй пра колькасць жылля, якое будуецца грамадзянамі ў індывідуальным парадку, нарматыўныя тэрміны яго будаўніцтва, а таксама кансервацыю.

Нэлі ЗІГУЛЯ



■ Нефармат

# Позняе дараванне,

## або Калі б не было вайны

У дні, калі краіна святкавала Дзень Перамогі, у сродках масавай інфармацыі, у сацыяльных сетках публікавалі нямала гісторый франтавікоў. Яны розныя. Толькі часцей за ўсё ўдзельнікі колішніх баёў згадваюць цяжкасці, геразім, боль ад страты таварышаў. Франтавікі рэдка гавораць пра тое, як вайна выядала душы, калечыла чалавечую псіхіку, як ламала лёсы. Ды і самі яны пра гэта наогул стараюцца не разважаць, хіба толькі іх родныя.

Гераіня аднаго з матэрыялаў маёй рубрыкі «Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары» расказвала сямейную гісторыю, правільней сказаць, сямейную драму сваіх бацькоў. Па зразумелых прычынах тая гісторыя ў тэкст асноўнай публікацыі не ўвайшла. Але ў памяці засела, хоць прайшло ўжо даволі часу. Дык вось, адна з апошніх жыхарак палескай вёскі вайну сустрэла малым дзіцем. Цалкам зразумела, што дзень, калі бацька сыходзіў на фронт, не памятае, але добра помніць, як вярнуўся. Згадвае, якой шчаслівай была маці, што прыйшоў, хоць хворы, паранены, але ж жывы! Маці зайздросцілі суседкі, якія не дачакаліся сваіх. Сваякі прыязджалі, каб парадавацца, адсвяткаваць шчаслівае вяртанне франтавіка.

Але вельмі хутка маці зразумела, што дадому прыйшоў не яе муж, якога яна праводзіла на вайну, а зусім іншы чалавек, азлоблены, нібы апустошаны знутры. Ён пачаў пакрысе співацца. Не тое страшна, што буяніў нападпітку, ён яшчэ горшым быў цвярозы, як быццам з яго некуды выйшла ўсё чалавечае. Цяпер гэта назвалі б, відаць, псіхалагічным гвалтам у сям'і. А тады... Вясковая бабулька расказвае пра свайго бацьку, які проста не даваў маці жыць. Рабіў гэта свядома, нават здзекаваўся. Кожны яе крок жорстка крытыкаваў, зневажаў, абзываў, паднімаў руку на вачах у дзяцей. Няшчаснай жанчыне было яшчэ цяжэй, што грамада яе асуджала, а не яго. Маўляў, не шануе мужа-франтавіка, ён, герой-пераможца, мае права строіць сям'ю. І ёй не было дзе падзецца. Яна цярпела і чакала, каб ён памёр, здароўе ж было страчана на вайне... Дачка ўжо падлеткам была, усё разумела, шкадавала маці. Потым бацькі не стала, ён памёр, але паспеў падарваць здароўе жонцы. І яна, жонка, яму не даравала. Цяпер спрабуе знайсці апраўданне і дараваць дачка: «Гэта вайна яго зрабіла такім. Хто ведае, што ён там бачыў, што перажыў. Ён ніколі не расказваў».

Яшчэ пра аднаго франтавіка і позняе дараванне расказала нядаўна калега. Гэта іх сямейная гісторыя, хоць і зусім іншая. Дзед яе мужа пайшоў на фронт з Яраслаўскай вобласці. Дома засталіся жонка з дзецьмі. Пры гэтым адна дачка хварэла, была інвалідам. Нацярпеліся яны найбольш ад голаду, як потым успамінаў сын франтавіка, быў час, што траву елі. Ён не ўсю вайну прайшоў, пасля цяжкага ранення камісавалі. Таму мог бы вярнуцца да сям'і ўжо недзе ў пачатку 44-га — яны ж так чакалі! Але пасля шпіталя муж і бацька сямейства паехаў да другой жанчыны. А сям'я яго асабліва моцна галадала ў першы пасляваенны год, ледзьве выжылі. Ды нешта не зладзілася ў яго і ў новай сям'і. Адным словам, вярнуўся той нядаўні салдат да жонкі і дзяцей недзе ў 46-м. Найбольш яскравы, а з гадамі — балючы, — успамін яго сына, свёкра маёй калегі, — вяртанне бацькі. Калі ён зайшоў у хату і выняў з кішэні жменю цукерак, крыху разлезлых без абгорткі, такія тады прадавалі. Відаць, самых танных. І як яны елі іх, памятаў.

Ці даравала яму жонка? Відаць, так. А вось сын... Да яго бацька прыехаў у 1969-м у Мінск паміраць. Жонкі ўжо не было, былы франтавік быў хворы на рак. Так ён і дажыў свой век у сям'і сына, тут пахавалі. Сын яшчэ зварыў на заводзе, дзе працаваў, металічную агароджу на магілу, паставіў яе, але больш туды не хадзіў. Так і не дараваў яму. Ранні сыход з жыцця маці, лічыў ён, менавіта на сумленні бацькі.

І вось толькі нядаўна ўнукі амаль выпадкова знайшлі тую магілу на адных са сталічных могілак і сталі яе даглядаць. Потым у інтэрнэце адшукалі і звесткі пра свайго дзеда — удзельніка вайны. Даведаліся, што да вайны ён быў кухарам у Яраслаўлі. І нечакана для сябе адкрылі, адкуль у праўнукаў схільнасць да кухарства, некаторыя з іх працуюць на прафесійнай аснове. Аналізуючы скупыя звесткі, унукі прыйшлі да высновы, што дзед іх быў зусім нядрэнным чалавекам. І ўсё магло б быць зусім іначай. Каб не вайна, якая перапісвала на свой лад сямейныя гісторыі, гнула і ламала характары, а не толькі забівала. Тым яна і страшная.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Будзь у курсе!

## БЧ падаўжае маршрут цягнікоў да Трускаўца

**З 1 чэрвеня да 29 верасня па ініцыятыве Беларускай чыгункі і па ўзгадненні з украінскім бокам прадаўжаецца маршрут руху цягніка № 371/372 Магілёў—Львоў да станцыі «Трускавец», паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.**

Цягнік будзе курсіраваць праз дзень адпраўленнем па няцотных чыслах з Магілёва і па цотных чыслах з Трускаўца.

З Магілёва цягнік будзе адпраўляцца ў 15.40, Мінска — 19.43, Баранавіч — 22.35 і прыбываць у Трускавец на наступныя суткі ў 13.20. З Трускаўца цягнік будзе адпраўляцца ў 15.00 і прыбываць на наступныя суткі ў Баранавічы ў 6.33, Мінск — 9.21, Магілёў — 13.25.

Да Львова і назад цягнік будзе ісці згодна з дзеючым раскладам. Глыбіня продажу білетаў — 45 сутак.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

Даты | Падзеі | Людзі

### 24 МАЯ

У краіне

*Дзень славянскага пісьменства і культуры. Адзначаецца ў гонар славянскіх асветнікаў і прапаведнікаў хрысціянства Кірылы і Мяфодзія, якія далі славянскаму свету кірыліцу (863 год) і заклалі падмурак беларускай, рускай і іншых славянскіх літаратур.*

**1904** год — нарадзіўся (в. Пясочнае, цяпер у Капыльскім раёне) Адам Русак, паэт, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У 1930 годзе скончыў Беларускі музычны тэхнікум, у 1934-м — Ленінградскую кансерваторыю. Працаваў салістам аркестра Ленінградскага Малога опернага тэатра, Белдзяржфілармоніі. Аўтар кніг паэзіі «Песні і вершы», «На родных палетках», кніг вершаў для дзяцей «У Буслаўцы», «Добра ведаю ўрок». Шырока вядомыя песні на вершы А. Русака «Бывайце здаровы», «Лясная песня», «Толькі з табою» і іншыя. Памёр у 1987 годзе.



У свеце

*Еўрапейскі дзень паркаў. Абвешчаны Еўрапейскай федэрацыяй нацыянальных і прыродных паркаў. 24 мая 1909 года ў Швецыі былі створаны першыя ў Еўропе дзевяць нацыянальных паркаў.*

**1743** год — нарадзіўся Жан-Поль Марат (1743—1793), палітычны дзеяч эпохі Вялікай французскай рэвалюцыі, урач, радыкальны журналіст, адзін з лідараў якабінцаў.

**1844** год — амерыканскі вынаходнік Сэмюэл Морзэ з дапамогай тэлеграфнага апарата ўласнай канструкцыі ўпершыню адправіў тэлеграму спецыяльным кодам (азбукай Морзэ).

**1905** год — нарадзіўся Міхаіл Шолахаў, рускі савецкі пісьменнік, грамадскі дзеяч, акадэмік АН СССР, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы. Аўтар раманаў «Узнятая цаліна», «Ціхі Дон», «Яны змагаліся за Радзіму» і іншых. Многія творы пісьменніка экранізаваны. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і Ленінскай прэміі.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.54 | 21.20 | 16.26 |
| Віцебск — | 4.36 | 21.17 | 16.41 |
| Магілёў — | 4.44 | 21.10 | 16.26 |
| Гомель — | 4.48 | 20.58 | 16.10 |
| Гродна — | 5.11 | 21.34 | 16.23 |
| Брэст — | 5.19 | 21.26 | 16.07 |

## Месяц

*Першая квадра 22 мая. Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Іосіфа, Кірылы, Мяфодзія, Макея, Нікадзіма, Расціслава, Сафрона.* **К.** *Жанны, Зузаны, Магдалены, Марыі, Вінцэнта.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Вырашыў паспрабаваць сябе ў ролі мастака. Сяджу без грошай і п'ю.**

Пасля інтыму.
Яна:
— Ну, ты дабіўся, чаго хацеў?
— Ну, зрэшты, так. А ты?
— Тэст пакажа.

**Калі добра харчавацца, у транспарце можна саступаць месца адразу дзвюм бабулькам.**

— У вас калектыў дружны?
— Ну, як дружны... Скажам так — жаночы!

**Жорсткі пераход да вегетарыянства — гэта калі жонка паглядзела па тэлевізары перадачу пра карысць раслінный ежы, а ты вярнуўся з рыбалкі.**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1896.
Нумар падпісаны ў 19.30 23 мая 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12